

# «ГЭТА НЕ ПРА ПАЛІТЫКУ. ГЭТА ЭКСПАРТ ПЕРШ ЗА ЎСЁ І НОВЫЯ ІНВЕСТПРАЕКТЫ»

**Тонкая настройка работы на знешнім контуры для дыпламатычнага корпуса ад Прэзідэнта**

(Стар. 2–7)

РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

1 ЖНІЎНЯ 2025 г. ПЯТНІЦА № 146 (30534)

Фота з архіва БелТА.



# ЦІХАЕ ПАЛЯВАННЕ ЦІ ГУЛЬНЯ НА ВЫЖЫВАННЕ?

**Каб першае не стала другім, варта нагадаць элементарныя правілы**

У гэтага дажджлівага лета, як і ў любой з'явы ў нашым жыцці, ёсць і пазітыўны бок. Цёплыя вільготныя дні і ночы — раздолле для грыбоў. Іх сёлета шмат ужо з чэрвеня. І аб тым, ці не схадзіць у лес на ціхае паляванне, задумваюцца нават тыя, хто з цяжкасцю адрозніць бярозу ад асіны, не кажучы ўжо пра грыбы.

Што ж, жаданне пахвальнае — адпачынак на прыродзе ды яшчэ з добрай перспектывай набраць ёе дароў — выдатны спосаб карысна правесці выхадныя. Але тут, як і ў любой з'явы ў нашым жыцці, ёсць і негатыўны бок. З лесу (асабліва незнаёмага) можна проста не вярнуцца, заблукаўшы. Ці, паспяхова вярнуўшыся, з'есці грыб і адправіцца (у самым лепшым выпадку) на бальнічны ложак...

Што рабіць, каб прыемныя лясныя прыгоды не ператварыліся ў лясныя здарэнні з сумнымі наступствамі? Адказ у двух словах: дасведчанасць і ўважлівасць. Ключавыя панацыі, якія дапамогуць застацца пры сваім. Здароўі і нават жыцці.

(Працяг тэмы на стар. 8-9)



НОВЫ МЕДЦЭНТР У СТАЛІЦЫ

7



ЖНІВЕНЬ ПАЧЫНАЕЦЦА З ДАЖДЖУ

15



+TV ПРАГРАМА

«ТАЯМНІЦА «ЧОРНЫХ ДРАЗДОЎ»

**Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале**

**@zviazdaby.**

**Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!**

TikTok

ПА ПАЛІЧКАХ

# ТРЫ Ў АДНЫМ

**За нерухомасць, зямлю і транспарт: якія падаткі і калі трэба выплаціць беларусам?**



Другі год запар мы будзем плаціць маёмасныя падаткі па новай схеме — г. зн. адным плацяжом. Калі і якім чынам мы атрымаем паведамленні, да якога часу трэба разлічыцца з падатковай інспекцыяй і ў каго ёсць ільготы, распавялі на прэс-канферэнцыі начальнік галоўнага ўпраўлення падаткаабкладання фізічных асоб Міністэрства па падатках і зборах Андрэй КАВАЛЕЎСКІ і намеснік начальніка ўпраўлення падаткаабкладання даходаў і маёмасці фізічных асоб галоўнага ўпраўлення падаткаабкладання фізічных асоб МПЗ Дзяніс ЦЕРАШКОЎ.

СТАР. 10

ISSN 1990 — 763X

25146

# «ГЭТА НЕ ПРА ПАЛІТЫКУ. І НОВЫЯ

## Тонкая настройка нашай работы

Глабальныя задачы, рэгіянальная спецыфіка і шматвектарны падыход. І на чале ўсяго — эканоміка. Супрацоўніцтва з усім светам, не пакідаючы Мінска, Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка разгледзеў з кіраўнікамі дыпламатычных прадстаўніцтваў краіны. На трохгадзіннай нарадзе абмеркавалі праблемы, прааналізавалі падыходы, ці, як кажуць дыпламаты, зверылі гадзіннікі — без палітычных тонкасцяў, прама і адкрыта, як заўсёды бывае на нарадах у кіраўніка дзяржавы.



### «МЫ ЖЫВЁМ У ВЕЛЬМІ СКЛАДАНЫ МІРНЫ ЧАС, КАЛІ ПАТРЭБНА ВАЕННАЯ МАБІЛІЗАЦЫЯ»

Перш чым прыступіць да разгляду пытанняў, вынесеных на парадак дня нарады, Прэзідэнт выказаў спадзяванне, што падобныя сустрэчы стануць традыцыйнымі. Гэта варта ўзяць на заметку Міністэрству замежных спраў і Адміністрацыі Прэзідэнта. Аляксандр Лукашэнка папярэдзіў: бягучы і будучы гады будуць вельмі складанымі і напружанымі. «Таму папярэджваю ўсіх прысутных, перш за ўсё службовых асоб, якія займаюцца эканомікай. Не крыўдзіцеся, але ціск і патрабаванні ў сувязі з гэтым будуць толькі павышацца, — сказаў ён. — Не толькі падчас вайны і ваенных дзеянняў даводзіцца мабілізавацца. Але і ў мірны час. Лічыце, што мы жывём у вельмі складаны мірны час, калі патрэбна ваенная мабілізацыя. Я хачу, каб усе прысутныя тут не толькі паслы, але і члены ўрада гэта засвоілі».

Па словах кіраўніка дзяржавы, неабходныя жорсткія, часам нетрадыцыйныя метады работы, але эканоміку краіны трэба ўтрымаць. Ён адзначыў, што гэта няпроста пры той ліхаманцы, якая прысутнічае на міжнародных рынках, у глабальнай эканоміцы. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў: у нас адкрытая эканоміка — палову таго, што мы вырабляем (можа, крыху больш), нам трэба прадаць і атрымаць адпаведныя выгады. «Таму толькі наперад! Ніякіх тлумачэнняў. Няма выніку — прабачце, вас там няма», — задаў тон нарады беларускі лідар.

### «МЫ ДАКАЗАЛІ ЎСЯМУ СВЕТУ, ШТО СУВЕРЭННЫЯ І НЕЗАЛЕЖНЫЯ»

Апошні раз падобная сустрэча ў такім фармаце для абмеркавання пытанняў знешняй палітыкі адбылася ў 2021 годзе. «Усяго 4 гады прайшло з той сустрэчы, але паглядзіце, як змянілася сітуацыя ў свеце! Ідзе фарміраванне новай міжнароднай сістэмы, і контуры шматпалярнасці бачныя ўсё больш», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Ён падкрэсліў, што апошнім часам шмат размоў па тую самую шматпалярнасць.

Прэзідэнт заўважыў, што ў сувязі з гэтым узнікаюць пытанні і сумненні, як бы з такой шматпалярнасцю не сапсаваць адносіны з асноўнымі партнёрамі — Расіяй і Кітаем. «Нічога падобнага. Вы павінны (прынамсі, пакуль я Прэзідэнт) запомніць адну ісціну, аксіёму: бліжэй, чым Расія, расійскія народы, для нас няма і быць не можа», — заявіў Аляксандр Лукашэнка. І не таму, што гэта «ўбілі ў галаву» ў савецкія часы. «Мы эканамічна, як вы бачыце праз шмат гадоў, адзіныя як ніколі. І апошнія, дзякуй богу, гады нас як ніколі раней у гэтым пераканалі», — адзначыў ён.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што самыя танныя энерганосьбіты ў Расійскай Федэрацыі. Бліжэй за ўсіх праз граніцу да нас Расійская Федэрацыя. Ваявалі і перамагалі Беларусь і Расія разам. «Наша эканамічная асноўная прастора, дзе мы можам прадаць сваю прадукцыю (нават у такіх складаных умовах, як сёння), — гэта Расійская Федэрацыя, — дадаў беларускі лідар. — Я не кажу ўжо пра ваенна-палітычнае супрацоўніцтва з Расіяй. Асабліва ў ваенннай галіне». Паводле слоў Прэзідэнта, у складаны час 2020 года Расія падставіла плячо, якое дапамагло выстаяць у той перыяд. «Для нас Расія — гарант нашай бяспекі», — рэзюмаваў ён.

Пракаментаваў Аляксандр Лукашэнка і размовы аб тым, што саюз з Расіяй нібыта пагражае беларускаму суверэнітэту. Ён расказаў, што падчас нядаўняга інтэрв'ю замежнаму выданню журналіст паведаміў: на граніцы з заходняга боку сустракаюцца надпісы пра тое, што Беларусь — краіна, «акупаваная Крамлём». «Нічога падобнага няма і быць не можа. Мы — суверэнная і незалежная дзяржава. І за апошнія дзесяціголдзі, колькі з вамі працуем, мы даказалі ўсяму свету, што суверэнныя і незалежныя, — заявіў кіраўнік дзяржавы. — І калі ўжо так разважаць, то паўстае пытанне: а прыхвасні ва Украіне, яны што — суверэнныя і незалежныя? І што было б, калі б яны былі суверэнныя і незалежныя, як яны разумеюць ці не разумеюць. Таму ўсё гэта ад таго, як мы гэта ўспрымаем».

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што спецыяльна гаворыць гэта для паслоў, каб тыя, у каго, магчыма, у галаве ёсць нешта шалёнае, выкінулі падобныя думкі. «Давайце будзем рабіць усё дзеля таго, каб мы былі суверэнныя і незалежныя. Хоць гэта вельмі дарага каштуе. Наша палітыка зыходзіць ад зямлі — усё зямное. Хто б мне што ні казаў, я заўсёды кажу: «Суседзі ёсць суседзі, іх не выбіраюць, яны ад Бога». А калі гэта суседзі — з імі трэба выбудоўваць адносіны», — заклікаў кіраўнік дзяржавы.

Па словах Прэзідэнта, сёння ідзе фарміраванне новай сістэмы і контуры шматпалярнасці бачныя ўсё больш выразна. Але шматпалярнасць не азначае адыход ад традыцыйных саюзнікаў — Расіі, Кітая і іншых.

«Зыходзячы з нашага становішча, мы і выбудоўваем дзяржаўную палітыку, называючы яе шматвектарнай. Яшчэ раз падкрэсліваю: гэта не значыць, што мы прадажныя такія і ад усіх адвярнуліся. Шматвектарнасць азначае, што мы памянялі курс развіцця і рвёмся туды за акіян або ў Еўрапейскі саюз. У нас ёсць там цікавасць, як і ва ўсіх. Гэта нашы суседзі, і з імі трэба выбудоўваць адносіны, бо быць бядзе. Мы бяды не хочам, ужо наеліся», — растлумачыў Прэзідэнт.

### «МАСКІ СКІНУТЫЯ КАНЧАТКОВА»

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на тое, што ў аснове фарміравання новай міжнароднай сістэмы — не дыктат «выбраных» краін, а прынцыпы ўзаемнай павагі і раўнапраўя, якія адкрываюць магчымасці для канструктыўнага дыялогу і супрацоўніцтва. «Але дзень, калі новая сістэма канчаткова ўступіць у свае правы, прыйдзе не сёння, а магчыма, і не заўтра, і не паслязаўтра. Заходнецэнтрычная мадэль не здаецца без бою, прычым у прамым сэнсе. Маскі скінутыя канчаткова. Усе іх пастулаты аб «свеце, заснаваным на правілах» сёння абвергнуты на вачах гэтага ж свету», — заявіў беларускі лідар. І прывёў канкрэтныя прычыны.

**Першая — гэта сітуацыя з правамі чалавека.** Аляксандр Лукашэнка нагадаў пра дзясяткі трупаў, якія нам перакідваюць праз граніцу тыя, хто паклікаў іх у свой «райскі сад». І ў цэлым пра міграцыйныя праблемы. Прэзідэнт згадаў, што з заходнімі суседзямі былі дасягнуты пэўныя дамоўленасці па міграцыйнай палітыцы. Паводле яго слоў, сутнасць яе была ў тым, што мы фактычна абараняілі іх ад гэтых «набегаў», канцэнтруючы ў сябе мігрантаў, а потым адпраўлялі ў заходнія краіны. «Яны ўвялі супраць нас абсалютна незаконныя неабгрунтаваныя санкцыі. І я шчыра сказаў: з «пятлёй на шыі» мы вас абараняць больш не будзем. Тым больш вы разарвалі ўсе адносіны з намі па міграцыйнай палітыцы», — расказаў Аляксандр Лукашэнка. Ізрабіў акцэнт на тым, што, тым не менш, беларускі бок адкрыты да ўсіх размоў і перагавораў па міграцыйнай палітыцы.

Прэзідэнт яшчэ раз растлумачыў тым, хто не разумее, палітыку нашай дзяржавы ў адносінах да мігрантаў, якія хочуць працаваць у Беларусі. «Гэта не значыць, што любы ў нас прыедзе і, грунтуючыся на прынцыпах правоў і свабоды чалавека, будзе тварыць усё тое, што яму захочацца, ці нават тое, што ўласціва іх культуры. Мы гатовыя тут прыняць усіх тых, хто хоча працаваць, хто паважае нашу дзяржаву і народ. Хто хоча паводзіць сябе годна і працаваць. І апошняе слова тут павінны сказаць паслы ў тых дзяржавах, адкуль яны сюды прыедуць. Без вас ніхто сюды ніякіх мігрантаў не пусціць», — заявіў кіраўнік дзяржавы. Ён акцэнтаваў увагу на тым, што адказнасць павінен несці і кіраўнік прадпрыемства, які бярэ на працу мігрантаў.

Паводле яго слоў, усе мігранты знаходзяцца на кантролі ў міліцыі і сёння да іх няма ніякіх прэтэнзій.

Кіраўнік дзяржавы таксама прапанаваў альтэрнатыву. «Мы наогул сюды нікога не пусцім. Але, каб добра жыць, заможна жыць, трэба ў тры разы лепш працаваць. Так? Вось альтэрнатыва. Давайце ў тры разы працаваць лепш. Прадукцыйнасць працы павінна быць у тры разы вышэйшай для таго, каб канкураваць на суседніх рынках», — сказаў ён.

Паводле слоў Прэзідэнта, гаворачы аб правах чалавека, трэба паглядзець на сектар Газа, дзе пакуты дзяцей пераносяць у Сярэднявечча. Трэба паглядзець на правы паралімпійскіх спартсменаў, якіх не пускаюць на спаборніцтвы. Аляксандр Лукашэнка іранічна пацікавіўся, што гэтыя людзі дрэннага зрабілі для тых, хто так дбае аб правах чалавека.

**Другі прыклад — прыватная ўласнасць.** «У адкрытую замарожваюць і крадуць актывы незалежных дзяржаў. Уводзяць без усялякіх абгрунтаванняў санкцыі, выкарыстоўваючы долар як зброю. Паверце, нічым добрым для долара гэта не скончыцца», — прывёў факт беларускі лідар. Паводле яго слоў, гістарычны працэс няўмольны, і ўжо відаць, як выраз «сусветная

# ГЭТА ЭКСПАРТ ПЕРШ ЗА ЎСЁ ІНВЕСТПРАЕКТЫ»

## на знешнім контуры ад Прэзідэнта

большасць» становіцца сістэмаўтваральным паняццем.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу: ужо відавочна, што БРІКС ператвараецца ў структуру, якую Захад адкрыта баіцца. Відавочна, як цэлыя інтэграцыйныя аб'яднанні, уключаючы наш ЕАЭС, усё больш адыходзяць у разліках ад долара ў нацыянальныя валюты. «І гэты працэс няўмольна будзе рухацца наперад», — канстатаваў беларускі лідар.

Прэзідэнт зрабіў акцэнт, што за гэтыя чатыры гады, знаходзячыся на адным з самых небяспечных разломаў глабальнага супрацьстаяння, Беларусь змагла захаваць галоўнае — мірнае неба над галавой. Нягледзячы на вельмі жорсткі эканамічны ціск, удалося забяспечыць людзей працай, даць рост даходаў і надзею на заўтрашні дзень.

### «ІМ ЛІШНІЯ РАТЫ ТАМ НЕ ПАТРЭБНЫ»

Кіраўнік дзяржавы асобна праінфармаваў усіх аб сітуацыі са збеглымі і «сядзельцамі», якія былі асуджаны за парушэнне закона. Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на тое, што некаторыя ў грамадстве сталі яго асуджаць за вызваленне гэтых асуджаных, і больш за ўсё лямату было ў збеглых. «Ім лішнія раты там не патрэбны, — адзначыў ён. — Ім гэта не трэба. Яны публічна маўчаць, але гвалтам там крычаць у сябе: не трэба». У прыклад Прэзідэнт прывёў апошняга сядзельца, якога прасілі адпусціць. «А цяпер крычаць: «Лукашэнка нас падмануў, выпусціў 15 чалавек, з іх 14 — тых, у каго заўтра тэрміны заканчваюцца. І адзін гэты сапсаваў нам усю «маліну». Але вы ж прасілі яго, ну дык бярыце. «Вось ён прарасійскі». А вы не ведалі, што ён — прарасійскі? Ведалі яго біяграфію, рабілі на яго стаўку нейкую. А рабілі стаўку на ўсіх, абы захапіць уладу. А потым, маўляў, разбяромся. Так не бывае ў палітыцы. Уладу могуць захапіць, як яны стаўку рабілі на ідыётаў і падонкаў, і яны могуць застацца ва ўладзе. Але яны думалі па-іншаму», — расказаў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт канстатаваў, што ніякага гандлю людзьмі тут няма. «Я катэгарычна быў супраць, як яны кажуць, абмену. Гэта мяне амерыканцы навучылі. На перагаворах яны прама пра гэта гаварылі. Я кажу: «Хлопцы, вы мяне да гэтага падштурхнулі. Хочаце — забірайце. Што ўзамен?» — «Мы падумаем». — «Ідзіце, думайце».

Таксама, паводле яго слоў, карміць і адзявяць гэтых людзей для дзяржавы нятанна. Аляксандр Лукашэнка расказаў, што прапаноўваў, калі захоча той бок, перадаць і некалькі тысяч іншых чалавек, якія асуджаны за розныя злачынствы: «Я ім апошні раз сказаў: «Хочаце — мы вам і гэтых дададзім». — «Не-не-не, гэтых не хочам, хочам вось гэтых».

### «ДЫПЛАМАТАМ НА ЗАХАДЗЕ НІ Ў ЯКІМ РАЗЕ НЕЛЬГА АДСЕДЖВАЦЦА»

Беларускі лідар адзначыў, што, нават будучы аб'ектам бруднай інфармацыйнай вайны, Беларусь змагла пашырыць кола сяброў на ўсіх кантынентах. «Гэта — вынік паслядоўнай рэалізацыі стратэгічнага выбару, падтрыманага нашымі грамадзянамі: абарона суверэнітэту, кіравальнасць эканомікі, цесныя саюзніцкія адносіны з брацкай Расіяй і вялікім Кітаем, адкрытае і сумленнае супрацоўніцтва з усімі краінамі — без папярэдніх умоў, забароненых тэм і аднабаковай выгады. Свой уклад у работу ўнеслі ўсе беларусы, у тым ліку прысутныя тут. Але гэта не значыць, што мы ўхапілі ўдачу за хвост і можам больш не напружвацца. Наадварот!» — падкрэсліў ён.

«Менавіта здольнасць своечасова адаптаваць свае дзеянні ў рамках агульнай мэты робіць уладу жыццяздольнай і дыпламатычна эфектыўнай», — растлумачыў ён. Гэта тонкая настройка нашай работы на знешнім контуры ў дачыненні да канкрэтных рэгіёнаў і агульных пытанняў і стала галоўнай тэмай размовы.

«У цэлым для нашай краіны, як і раней, краевугольным каменем застаецца эканоміка. Мы — сярэдняя, невялікая па еўрапейскіх мерках краіна з адкрытай эканомікай, арыентаванай на экспарт. Таму нарошчванне і эфектыўнасць знешняга гандлю — безумоўны прыярытэты, без чаго нам ніяк не выжыць», — арыентуе дыпламатаў беларускі лідар. Ён звярнуў увагу на тое, што гэту ўразлівасць спрабуюць выкарыстаць супраць нас і эканамічныя канкурэнты, і палітычныя апаненты, збеглыя. Еўрасаюз з 2020 года нештампаваў аж 18 пакетаў санкцый. Праўда, чым далей, тым павольней. Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што ў 2022 годзе было прынята 5 пакетаў санкцый, потым — 4, затым — 3. Сёлета пакуль 1.

«Няма чаго больш забараняць? Ці адчулі, што страляюць сабе ў нагу? Па мне, дык і тое, і другое», — іранічна адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт расказаў, што па лініі МЗС яму дакладваюць аб прыкметах расколу еўрапейскага «адзінства», асабліва ў тэме міграцыі. «Добра, калі так. Добра, калі ў выніку немцы паставяць на месца палякаў і прыбалтаў, назавуць сапраўдных вінаватых і заблакіруюць схемы ўвозу мігрантаў, — падкрэсліў ён. — Але нам важна, каб гэты праславуты раскол унутры Еўрасаюза перакінуўся і на нашу тэму — на антыбеларускую палітыку ЕС. З якімі краінамі можна пра гэта гаварыць у першую чаргу, МЗС мне дакладваў. Канкрэтныя меры павінны быць ужо ў рабоце».

Аляксандр Лукашэнка заявіў, што дыпламатам на Захадзе ні ў якім разе нельга адседжвацца. «Не прымаюць палітыкі — трэба актыўна ўзаемадзейнічаць з бізнес-коламі. Многія з іх ужо ініцыятыўна шукаюць магчымасці супрацоўніцтва з намі для ўласнага выжывання. Трэба ўсюды пашыраць кантакты з рэгіянальнымі ўладамі, не ўцягнутымі ў агульны вэрхал сваіх сталіц. Будзе ў Еўрасаюзе правы або левы паварот — нам усё роўна. Важна, што народ усё больш стамляецца ад эліт, якія яго не чуюць і ігнаруюць яго волю на выбарах. Вечна так працягвацца не можа. А ў наступнай хвалі палітыкаў павінны быць тыя, каго вы ведаеце і хто ведае Беларусь. Цяперашнюю. Стратэгія «дэмакратызацыі санкцыямі» праваліліся. Убачыце, што неўзабаве пачнецца канкурэнцыя сярод новых канцэпцый. Там павінны загучаць разумныя галасы тых, з кім вы папрацуеце», — паставіў задачы кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка заявіў, што сыходзіць з еўрапейскага рынку і проста адварнуцца ад ЕС нам ні ў якім разе нельга. Гэта суседзі, а іх, як вядома, не выбіраюць.

«Магчымасці адкрываюцца. Нейкія — у Еўропе, а нейкія і за акіянам. Вы ведаеце прынцып таго ж Трампа: «Амерыка перш за ўсё». Але, можа, лепш так, чым «ліберальны светапарадак», які існаваў пры былым прэзідэнце Байдэне, — сказаў Прэзідэнт. — Апошнія сустрэчы з амерыканцамі паказалі, што яны гатовы слухаць. Без усялякага паддобрывання з нашага боку. Вяртанне Трампа адкрыла акно магчымасцяў для паляпшэння адносін. Можа, і для разбору нейкіх завалаў, якія нагарадзілі амерыканцы і якія перашкаджаюць нашай рабоце на сусветных рынках. Наша задача — скарыстацца гэтым шанцам, але цвёрда стаяць на абароне інтарэсаў Беларусі, не згаджаючыся на ўступкі на шкоду сабе».

### «АД НАС ПАТРАБУЕЦЦА ТАКТЫЧНАЯ ГНУТКАСЦЬ»

Што датычыцца паслоў у незаходніх краінах, а таксама ўрада і рэальнага сектара эканомікі, кіраўнік дзяржавы паўтарыў непарушнае: забыцца пра санкцыі і іншыя заходнія «страшылкі»: іх у нас няма. Прынамсі, па яго словах, гэта не апраўданне для нейкіх правалаў і адсутнасці вынікаў.

«Увёў ЕС чарговую вар'яцкую забарону — вось вам дадатковыя аб'ёмы прадукцыі для рэалізацыі іх на іншых рынках! — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Пастаўленая мной задача пераарыентаваць у дружалюбныя дзяржавы экспартныя патокі на суму 14 мільярдаў долараў, якія выпалі з заходняга і ўкраінскага напрамкаў, у цэлым выконваецца». Прэзідэнт адзначыў, што па выніках 2024 года ўдалося нарасціць аб'ём экспарту айчынных тавараў і паслуг амаль да 50 мільярдаў долараў.

«Праўда ў тым, што мы вырабляем патрэбную людзям прадукцыю годнай якасці па справядлівай цане, а таму попыт на яе будзе заўсёды. Але ад нас патрабуецца тактычная гнуткасць, пастаянная актуалізацыя нашай знешнегандлёвай палітыкі», — звярнуў увагу беларускі лідар. Ён абмаляваў сітуацыю, якая складваецца. У самы складаны перыяд — з 2020 да 2023 года — у нас былі максімальныя паказчыкі якасці знешняга гандлю. У 2022 годзе рэкорднае дадатнае сальда — 4,3 мільярда долараў, амаль 6 працэнтаў ВУП. А далей «паплылі», заўважыў Прэзідэнт. Летась ужо мінус больш за мільярд долараў, за 5 месяцаў бягучага года — мінус амаль 800 мільёнаў.

«Пры гэтым імпарт працягвае расці. І тут ужо ўзнікае пытанне да ўрада: атрымліваецца, у нашых прадпрыемстваў цяжкасці з разгрузкай складоў, разлікамі і лагістыкай толькі пры экспарце, а пры ўвозе замежнай прадукцыі іх няма? Або імпартуе прыватнік, а экспартуе дзяржкампанія без асаблівага жадання напружвацца? Прычым заўважце: замежныя контрагенты выкарыстоўваюць усе магчымасці зарабіць — і на пастаўках да нас, і на закупках нашай прадукцыі, — адзначыў Прэзідэнт і задаў пытанні, якія вынікаюць з гэтага. — Чаму ў нас тэмп экспарту тавараў у 2024 годзе адносна 2020-га быў амаль 140 працэнтаў, а паслуг — толькі 112? Не трэба ўсё зводзіць да айцішнікаў, тым больш што па камп'ютарных паслугах у гэтым годзе рост аднавіўся (плюс 71,5 мільёна долараў)».

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, калі закрылі рынак Еўрапейскага саюза для нашых транспартнікаў, дык гэтых ж тавар трэба дастаўляць далей — у Расію, у Кітай, у Афрыку! «Ураду неабходна нарэшце разабрацца, у чым праблема: нашы лагістычныя кампаніі не могуць сфарміраваць канкурэнтныя тарыфы або нашы дырэктары працягваюць прадаваць «ад плота» і грузіць на замежны транспарт? Мы павінны максімальна пакінуць сабе валютную выручку па ўсім ланцужку: ад транспартных і страхавых паслуг да фасоўкі і дробнааптовых продажаў», — даручыў Прэзідэнт.

Па асобных сектарах станоўчыя зрухі ў наяўнасці: за 3 апошнія гады нарасцілі экспарт у сферы машынабудавання на 3 мільярды долараў, харчавання — амаль 2 мільярды, лёгкай прамысловасці — на 300 мільёнаў. Але, звярнуў увагу кіраўнік дзяржавы, у іншых ключавых галінах сур'ёзныя страты. Мінус па паліўна-энергетычных таварах — амаль 2 мільярды долараў, па хімічнай прадукцыі — 1 мільярд, па дрэваапрацоўцы — амаль мільярд, па металапрадукцыі — 250 мільёнаў.

«Не можам — значыць, трэба мяняць наменклатуру, перабудоўваць вытворчасць, прымяняць новыя фінансавыя інструменты (грошы на гэта ў нас ёсць). Аператыўна ўнясіце канкрэтныя прапановы!» — паставіў яшчэ адзін блок задач кіраўнік дзяржавы.

***(Працяг на 4–5-й стар.)***



# «ГЭТА НЕ ПРА ПАЛІТЫКУ. І НОВЫЯ

## РАСІЯ. ПРАВЕРКА НА ТРЫВАЛАСЦЬ

Асобную ўвагу беларускі лідар звярнуў на геаграфію экспарту па некаторых напрамках. «Нашы адносіны з Расіяй цяпер на вельмі высокім пад'ёме. Мінск і Масква разам прайшлі сур'ёзную праверку на трываласць. І вытрымалі гэтае выпрабаванне. Вытрымалі таму, што той Саюз, які мы выбудавалі з Расіяй, — гэта не проста прыгожы фасад, а рэальна дзейны механізм, пры ўсіх выдатках», — Аляксандр Лукашэнка пачаў з найбліжэйшага партнёра. Ён прывёў факты. У 2022—2024 гадах мы змаглі пераарыентаваць на расійскі рынак істотныя аб'ёмы паставак, нарасціць вытворчасць і продажы там, дзе гэта было трэба расіянам. У Расію сышоў асноўны прырост экспарту за 3 гады — плюс 10 мільярдаў долараў. «Расіяне гатовыя фінансаваць многія праекты, гатовыя плаціць. Але няма чаму здзіўляцца: яны найперш гатовыя заплаціць і прафінансаваць тыя праекты, якія, перш за ўсё, патрэбныя Расіі. Гэта ж натуральна. А ў нас ёсць для гэтага вытворчасці, школы, трэба толькі разгарнуцца, узяць тыя грошы», — адназначыў кіраўнік дзяржавы. Паводле яго слоў, некаторыя прадпрыемствы гэта паспяхова робяць, а некаторыя ўсё чагосьці чакаюць. Як падкрэсліў Прэзідэнт, доля Расійскай Федэрацыі ў нашым экспарце дасягнула ўжо 65 працэнтаў. У пастаўках Мінпрама і «Беллегпрама» — амаль 90 працэнтаў, Мінбудархітэктуры — 80, Мінсельгасхарча — 70, «Беллеспаперапрама» — палова.

«Як быццам гэтыя тавары не патрэбныя на іншых рынках? — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. — Усе топчуцца на адным рынку, сітуацыя на якім зноў памянялася. Сёння не 2022 год, калі адтуль беглі заходнікі. Сёння расійскі рынак перанасычаны, канкурэнцыя становіцца больш жорсткай. І ці тое яшчэ будзе. Пад выглядам імпартазамяшчэння туды пранікаюць тавары з трэціх краін без усялякай лакалізацыі, выцясняючы нашу прадукцыю. Так быць не павінна, мы не для гэтага стварылі Саюзную дзяржаву». Як вынік, са студзеня да мая экспарт тавараў у Расію прасеў на 320 мільёнаў долараў па прадукцыі машынабудавання (легкавыя машыны, трактары, камбайны).

**У сувязі з гэтым Прэзідэнт пазначыў задачы, якія павінны стаць прыярытэтнымі для ўрада:**

*1. Абарона нашага саюзнага рынку ад тавараў з трэціх краін.*

*2. Запуск, нарэшце, адзінай прамысловай палітыкі, якая пакуль толькі на паперы, — з допускам да конкурсаў па продажы тэхнікі і каардынацыяй па дублюючых вытворчасцях.*

*3. Развіццё новых для Беларусі сегментаў эканомікі, уключаючы авія- і суднабудаванне, атамную энергетыку і касмічную прамысловасць.*

*4. Развіццё мультыбрэндавых і сэрвісных цэнтраў, беларускіх гандлёвых дамоў у рэгіёнах Расіі.*

«У выніку: сваю долю на расійскім рынку мы не аддаём і жорстка абараняем, дзе можам, — павялічваем продажы і замацоўваемся за кошт каапераціі і высокага сэрвісу», — патлумачыў Прэзідэнт. Ніводнаму з нашых прадпрыемстваў не трэба чакаць, пакуль попыт зноў ажывіцца. «Трэба аператыўна дыверсіфікавацца, — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. — Балазе, ёсць куды».

(Працяг. Пачатак на 2-й стар.)



## ЕАЭС. КОЖНЫ КРОК ПАВІНЕН ПРЫНОСІЦЬ ВЫГАДУ

Аляксандр Лукашэнка адзначыў станоўчыя вынікі супрацоўніцтва з Азербайджанам, Грузіяй, Таджыкістанам, Туркменістанам і Узбекістанам. За 4 гады экспарт у гэтыя краіны падвоіўся, а дадатнае сальда дасягнула 2 мільярдаў долараў. «Але гэта пакуль. Расслабіцеся — атрымаеце мінус», — папярэдзіў ён.

Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, Еўразійскі эканамічны саюз ужо сёння дэманструе годныя вынікі. «З улікам нашага старшынства ў гэтым годзе беларускі парадак дня па інтэграцыйным контуры павінен быць рэалізаваны ў поўным аб'ёме, а нашы прыярытэты знойдуць адлюстраванне ў стратэгіі развіцця ЕАЭС на наступнае дзесяцігоддзе», — адзначыў беларускі лідар. Ён заўважыў, што хоць шэраг партнёраў па Саюзе не заўсёды на адной хвалі з Мінскам, неабходна не дапускаць тармажэння з іх боку пры вырашэнні агульных задач аб'яднання.

«Кожны крок у інтэграцыі павінен прыносіць Беларусі адчувальную выгаду. Калі мы адкрываем свой рынак, то наўзамен разлічваем на сувымерныя прэферэнцыі, а не на туманныя абяцанні», — заявіў Аляксандр Лукашэнка. У прыклад ён прывёў падпісаныя нядаўна ў Мінску гандлёвыя пагадненні з Манголіяй і ААЭ, надзвычай выгадныя для нас — абедзве дзяржавы пагадзіліся даць ільготны рэжым для больш чым 90 працэнтаў беларускага экспарту. Да канца года плануецца падпісаць пагадненне з Інданезіяй — велізарным і перспектыўным для нас рынкам. «Яе кіраўніцтва шчыра зацікаўлена ў супрацоўніцтве з Беларуссю, — адзначыў ён. — Галінам ужо сёння разам з пасольствамі трэба пачаць прапрацоўку паставак тавараў у гэтыя краіны па новых, выгадных для нас умовах».

## КРАІНЫ ДАЛЁКАЙ ДУГІ. ПРАБІВАЦЦА НА ІХ РЫНКІ.

Прэзідэнт нагадаў, што летась паслам былі дадзены дадатковыя магутныя інструменты для работы на далёкай дузе, маючы на ўвазе членства ў Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва і партнёрства з БРІКС. Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што гэта найсур'ёзнейшыя вынікі сістэмных знешнепалітычных намаганняў апошніх гадоў.

«Па саміх гэтых структурах стратэгіі зацверджаны, — удакладніў Аляксандр Лукашэнка. — Зыходжу з таго, што яны будуць безумоўна рэалізаваны і МЗС, і іншымі дзяржорганамі пад кантролем урада. Але, з пункту гледжання эканомікі, ШАС і БРІКС даюць нам унікальны фармат адносін з дзяржавамі, якія вызначаюць і будуць вызначаць будучы светапарадак: Расія, Кітай, Індыя, Пакістан, Бразілія, ПАР, ААЭ, Эфіопія і Егіпет. У нас цяпер ёсць агульная пляцоўка для работы з Нігерыяй, Малайзіяй, Тайландам, іншымі ўдзельнікамі БРІКС. У палітыцы іх дзверы для нас адчыненыя. Гэтым трэба карыстацца і прабівацца на іх рынкі».

## КІТАЙ. ЗАЙМАЦЦА ТЫМ, У ЧЫМ МЫ МОЖАМ СЁННЯ АТРЫМАЦЬ ПОСПЕХ

Ключавым партнёрам Беларусі на далёкай дузе, безумоўна, застаецца Кітайская Народная Рэспубліка. Прэзідэнт звярнуў увагу на тое, што ўжо сёння тавараабарот з КНР складае 8,5 мільярда долараў і на мільярд перавышае гандаль з усім Еўрапейскім саюзам. Але і тут, па словах беларускага лідара, за агульнай лічбай трэба бачыць больш шырокую карціну супрацоўніцтва і ролю Кітая для будучыні нашай эканомікі.

Аляксандр Лукашэнка канстатаваў, што на вышэйшым узроўні пастаўлена задача стымуляваць сумеснае тэхналагічнае развіццё, забяспечыць прыход у Беларусь самых сучасных кітайскіх тэхналогій. Сферы дакладна вызначаны: станкабудаванне, мікраэлектроніка, нафтахімія, фармацэўтыка і інш. Кіраўнік дзяржавы даручыў паслам разгортваць практычную работу на ўзроўні галін і рэгіёнаў.

«Але калі мы, машынабудаўнічая краіна, не можам вытрымаць канкурэнцыю ў машынабудаванні, ва ўзбраеннях і яшчэ ў чымсьці, ёсць вельмі прасунутыя тут дзяржавы, — заўважыў Прэзідэнт. — Ну не можам аб'ектыўна. Гэта іх трэба дагнаць, а потым перагнаць і гэтак далей. Але давайце развівацца там, дзе мы можам, дзе не трэба нафта для гэтага, дзе не трэба для гэтага прыродны газ, рэдказямельныя нейкія металы і матэрыялы. Давайце будзем развіваць тую ж айцісферу, будзем развіваць фармацыю. Не хлусіць, што мы, як пры Піневічы (Дзмітрый Піневіч — экс-міністр аховы здароўя. — **«Зв».**), дасягнулі больш паловы вытворчасці ўласных лекаў. А калі пачынаем глыбей капацца, усё не так проста. Таму давайце будзем займацца тым, у чым мы можам сёння атрымаць поспех і ў чым на рынку вялізная патрэба. Давайце туды будзем інвеставаць. Давайце будзем інвеставаць туды, для чаго ў нас ёсць сыравіна».

У якасці прыкладу Аляксандр Лукашэнка прывёў перапрацоўку драўніны. «У нас што ні ўраган, то праблема, — заўважыў ён. — Пад ціскам Прэзідэнта лес паламаны-пераламаны апрацавалі, вывезлі, склалі на ўзлеску — і цішыня. Усё гніе. Пытанне, навошта мы вывозілі тады гэты лес і ратавалі ад буралому? І цяперашні прэм'ер, учарашні губернатар, гэта вельмі добра ведае і разумее. Ну дык дзейнічайце! Гэта ж мы можам перапрацаваць. Ах, смецце ўсё перапрацавалі, выравілі пелеты — няма куды дзяваць. Паехаў на прадпрыемства, паглядзеў, пытаюся: «Пелеты патрэбны ў свеце?» — «Патрэбны». «Прадаяце?» — «Прадаём. І не ў страту». Так, маржынальнасць нізкая цяпер у сувязі з тым, што сышоў Еўрапейскі саюз, але ён прыйдзе. І на іншых рынках з маленькім прыбыткам, але вынік ёсць. Дык гэта смецце перапрацавалі. Паглядзіце, колькі на ўзлесках у вас, а часам знахабіліся леснікі разам з кіраўнікамі сельгаспрадпрыемстваў — проста на поле вывезлі і паклалі гэты лес. Двайная шкода. Вывезлі — згніе (валяецца дагэтуль) і занялі гектары ўрадлівых зямель. Таму калі ў нас ёсць сыравіна, найвялікшы рэсурс (ніжэй Кіева, як я кажу, на поўдзень ад Кіева няма драўніны), давайце будзем вырабляць тое, што трэба свету. Давайце будзем дамаўляцца з іншымі краінамі: няхай прыязджаюць, разам з намі ствараюць сумесныя прадпрыемствы і перапрацоўваюць гэту драўніну».

У гэтай сувязі Аляксандр Лукашэнка нагадаў пра ранейшыя дамоўленасці з Аманам, які гатовы ствараць сумесныя прадпрыемствы. «Ужо паўгода цяляемся пасля майго візіту туды, — удакладніў Прэзідэнт. — Праз паўгода вы прыйдзеце і пачняце мне казкі расказваць, як гэта трэба рабіць. І спатрэбіцца яшчэ некалькі гадоў, пакуль мы прыступім да будаўніцтва, а можа быць, і не прыступім увогуле. Гэта што, палітыка?»

Ад урада і пасольства найперш у Кітаі патрабуецца ўсёабдымнае садзейнічанне на ўсіх этапах распрацоўкі канкрэтных сумесных праектаў: ад аналізу рынку і работы з інвестарамі да каардынацыі і суправаджэння. Пры гэтым кіраўнік дзяржавы скіроўвае не кідацца на першую прапанову, якая трапляе. «Не трэба агулам, не трэба ўсё рабіць чохам», — арыентуе Прэзідэнт, акцэнтуючы ўвагу на тым, што да ўсяго трэба падыходзіць па-гаспадарску.

У цэлым, азіяцкаму вектару Беларусь, па словах кіраўніка дзяржавы, удзяляе дастаткова шмат увагі. На вышэйшым узроўні адпрацоўваюцца В'етнам, Інданезія, Іран, Манголія, М'янма, Пакістан. МЗС дакладвае аб перспектывах па Тайландзе і Лаосе.

«Пры гэтым тэмп росту экспарту ў Азію пакуль ніжэйшы, чым у цэлым па краіне ў перыяд з 2020 года, — канкрэтызуе Аляксандр Лукашэнка. — Таму трэба дзейнічаць нашмат больш актыўна, асабліва з улікам сітуацыі на расійскім рынку».

## КРАІНЫ ПЕРСІДСКАГА ЗАЛІВА. УЗЯЦЬ СВАБОДНЫЯ ГРОШЫ І КАПІТАЛЫ

Устойлівы дыялог на вышэйшым узроўні наладжаны з вядучымі краінамі Персідскага заліва: Аб'яднанымі Арабскімі Эміратамі, Аманам, Саудаўскай Аравіяй, Катарам. Аднак Прэзідэнт хоча бачыць канкрэтную манетызацыю ўзаемаадносін — выгадныя гандлёвыя і інвестыцыйныя праекты. «Такія, напрыклад, як беларускія хабы ў Эміратах, у Амане для магчымай вытворчасці і прасоўвання нашай прадукцыі ў іншыя краіны Блізкага Усходу і Афрыкі», — канкрэтызаваў ён.

Кажучы пра ўзаемадзеянне з Аб'яднанымі Арабскімі Эміратамі і Аманам, Аляксандр Лукашэнка скіраваў увагу Міністэрства замежных спраў на тое, што тут больш чаканняў і надзеі, чым рэалій. «Тут мы Бога за бараду не ўзялі яшчэ, ніякіх хабаў мы яшчэ там не стварылі, — заўважыў ён. — Мы

# ГЭТА ЭКСПАРТ ПЕРШ ЗА ЎСЁ ІНВЕСТПРАЕКТЫ»

толькі марым аб тым, што яны там павінны быць. Давайце дзейнічаць. Яшчэ раз кажу: для мяне пасол і пасольства — гэта не пра палітыку. Гэта экспарт перш за ўсё прадукцыі (гандаль) і новыя інвестпраекты (тэхналогіі і працоўныя месцы). Толькі так мы будзем вас ацэньваць. Пастаянна вам кажу: у свеце шмат свабодных грошай і капіталаў, але іх трэба ўмець узяць. Прыводзьце іх у Беларусь».

У сувязі з гэтым кіраўнік дзяржавы заклікаў стварыць зразумелы пералік і ўмовы інвестыцый да нас, прыбраць махровую бюракратыю і прымусіць працаваць на вынік нашы так званыя інстытуты развіцця: Нацыянальнае агенцтва па інвестыцыях, Цэнтр маркетынгу і кан'юнктуры цэн, Беларускую гандлёва-прамысловую палату і гэтак далей.

## АФРЫКА. НЕ ПРАСПАЦЬ

Кажучы аб супрацоўніцтве з Афрыкай, Аляксандр Лукашэнка нагадаў, колькі прыйшлося «цягнуць» туды нашых міністраў і штурхаць прадпрыемствы. «Сцвярджалі, што працаваць нельга, — удакладніў ён. — Цяпер глядзіце на вынікі. Нават па Зімбабвэ, якая пад санкцыямі, Нігерыі. Аказваецца, усё можна рэалізаваць».

Пры гэтым ва ўзаемадзеянні з афрыканскімі краінамі беларускі лідар бачыць больш патэнцыял, у прыватнасці ў пастаўках сельгастэхнікі. «Перш за ўсё ў іх праблема — накарміць і вылечыць народ, — канстатаваў Прэзідэнт. — Мы па Зімбабвэ бачым. 30 мільёнаў чалавек, мора для нас работы. Трэба накарміць. І так усюды. Ім перш чым купіць у нас сістэму «Тор-М2», «Бук», якую мы стварылі, ім трэба народ накарміць. Наша тэма. І яны з гігантамі праз зубы, але неяк супрацоўнічаюць, а з намі, з дзяржавай сярэдніх памераў, невялікай дзяржавай, яны разумеюць, што мы ім дыктаваць парадак дня ўнутраны не будзем. І яны імкнуцца да такіх краін. І я на перагаворах іх пазіцыю гэту падтрымліваю. Таму ў Афрыку, Азію і Лацінскую Амерыку, якую мы страцілі фактычна, трэба ісці».

«З Афрыкай трэба супрацоўнічаць, гэта будучыня, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Калі мы там умацуемся, калі мы там прасунем свой інтарэс, яны будуць супрацоўнічаць з намі заўсёды, бо мы гэта робім прыстойна. Таму, гледзячы на Зімбабвэ і тую ж Нігерыю, можам іншыя краіны ў прыклад прывесці, я ўжо не кажу аб Егіпце, Алжыры, з якімі мы даўно супрацоўнічаем, аказваецца, усё можам рэалізаваць».

Прэзідэнт удакладніў, што на ўзроўні віцэ-прэм'ера даводзіцца сумежныя прадпрыемствы падключаць, каб выканаць заказы ў тэрмін. Пры гэтым, па яго словах, урад рапартуе: разгрузілі склады.

«За адзін 2024-ы экспарт у Афрыку павялічыўся ў 3,5 раза да рэкорднага паказчыка ў амаль 650 мільёнаў долараў, — канкрэтызаваў Аляксандр Лукашэнка. — Сёлета за 5 месяцаў дадалі яшчэ 150 мільёнаў долараў, а доля Афрыкі ў нашым экспарце ўзрасла з 1,5 да больш як 3 %. Зразумела, па якой схеме гэта працуе. Зразумела, што ў дырэктара «Лідсельмаша» не будзе такога кантакту з афрыканскімі прэзідэнтамі-прэм'ерамі, як у некаторых прадпрыемальнікаў. Дык, можа, пара, каб і ў іншых беларускіх бізнесменаў вочы адкрыліся на гэты рэгіён? Там 54 краіны — усім месца хопіць. Гэта будучы макрарэгіён нумар адзін па тэмпах росту».

У гэтай сувязі кіраўнік дзяржавы нагадаў, як у канцы 1990-х — пачатку 2000-х беларусы заходзілі ў Кітай. «Цяпер тое ж самае з Афрыкай, — прывёў аналогію беларускі лідар. — «Праспім» Афрыку — страцім прырост сваёй эканомікі ў будучыні. Самі прадпрыемствы павінны нарошчваць кампетэнцыі, мэтанакіравана вучыцца працаваць на афрыканскім кантыненце. Наша задача цяпер — не ўтрымаць станоўчую дынаміку, а магутна і ў прыярытэтным парадку замацавацца на афрыканскім рынку, выйсці на ўстойлівы мільярд, а лепш — 1,5 мільярда экспарту ў год да канца нашай пяцігодкі». За канкрэтныя вынікі дыпламатаў чакаюць заахвочванні.

## ЛАЦІНСКАЯ АМЕРЫКА. АСВАЕННЕ НОВЫХ ПЕРСПЕКТЫЎНЫХ РЫНКАЎ

З жалем Аляксандр Лукашэнка ўказаў на прасяданне лацінаамерыканскага напрамку. «Мінус 100 мільёнаў долараў да ўзроўню 2020 года, — канкрэтызаваў ён. — Экспарт у гэты рэгіён прадаўжае залежаць выключна ад паставак калійных угнаенняў. І гэта нягледзячы на сур'ёзнае ўмацаванне дыялогу з нашымі асноўнымі партнёрамі ў рэгіёне: Венесуэлай і Кубай, а таксама наяўнасць пасольстваў у Аргенціне, Бразіліі і Калумбіі. Бачу, што ў мінулым годзе ўрад займаўся толькі Нікарагуа, падключыўшы рэсурсы Банка развіцця. Спадзяюся, гэты крок пралічаны і дасць эфект».

Прэзідэнтам узгоднены прапанаваныя ўрадам механізмы падтрымкі экспарту ў мэтах асваення новых перспектыўных рынкаў. Фінансавыя рэсурсы, патрабуе кіраўнік дзяржавы, павінны выдзяляцца не толькі пад доўгатэрміновыя экспартныя кантракты, але і пад кропкавае развіццё ўласнай тавараправоднай і лагістычнай інфраструктуры за мяжой.



Аляксандр Лукашэнка прапанаваў яшчэ раз паглядзець, як працуе інстытут замацавання службовых асоб і кіраўнікоў за краінамі. «Дадзеная сістэма — не ганаровае званне і не грамадская нагрузка», — акцэнтаваў увагу ён і ў якасці прыкладу прывёў апошнія мерапрыемствы намесніка Прэм'ер-міністра Віктара Каранкевіча ў Афрыцы. Па меркаванні беларускага лідара, гэтак жа ўсе замацаваныя асобы павінны прадметна паглыбляцца ў тэму і дасягаць выніку.

## «ЧАС ВАЕННЫ, ТУРЫСТЫЧНЫХ ПАЕЗДАК НЕ МОЖА БЫЦЬ»

Падчас нарады была ўзнята праблема эфектыўнасці замежных камандзіровак. «Мы вярнуліся да таго, што было ў 1990-я гады мінулага стагоддзя: па ўсім свеце раз'язджаліся, як турысты, — канкрэтызаваў кіраўнік дзяржавы. — Мне даваліся вярнуцца да гэтай праблемы тады і спыніць усялякія непатрэбныя камандзіроўкі. Адміністрацыі Прэзідэнта даручана капітальным чынам узяць праблему на кантроль. Дарэчы, з падачы (трэба аддаць належнае) Адміністрацыі Прэзідэнта. Таму любая камандзіроўка (мы нікога не стрымліваем: хочаце — едзьце), але адтуль прывязіце штосьці. Хаця б па двух пытаннях, па паўтара, па адным пытанні, але не проста: «Дайце мне паляцець туды», бізнес-клас і іншае — і выходзяць мільёны-мільёны долараў у год. А іх не проста зарабляць. Таму, калі едзеце ў камандзіроўку, галоўнае — што вы адтуль прывезлі». Адміністрацыі Прэзідэнта даручана ўзяць гэта пытанне на жорсткі кантроль.

«Час ваенны, турыстычных паездак не можа быць», — патлумачыў такое рашэнне беларускі лідар і даручыў ураду канкрэтна прапісаць, па якіх крытэрыях будзе ацэньвацца эфект ад такіх мерапрыемстваў.

## «ВЫ БОЛЬШ ЧЫМ ВАЙСКОЎЦЫ. ВЫ — АБЛІЧЧА НАШАЙ КРАІНЫ»

Ставячы перад МЗС маштабныя задачы, Аляксандр Лукашэнка добра разумее, што іх выкананне залежыць ад кадравай палітыкі. «Міністэрства замежных спраў, нашы паслы ў прамым сэнсе знаходзяцца на перадавой, абараняючы нацыянальныя інтарэсы, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Калі прызначалі цяперашняга міністра, галоўным даручэннем было — прынцыпова новы падыход да кадравай работы, тым больш ён не навічок у гэтым, ён займаўся гэтай справай у Адміністрацыі Прэзідэнта. Дзяржаве патрэбны сумленныя і крыштальна чыстыя людзі, адданыя сваёй краіне. Тут няма месца здрадзе і кумаўству, чым заўсёды грашыў наш МЗС. Было. Баюся, што нешта ёсць і цяпер. Апраўданняў тут, мужыкі, быць не можа. Паслухайце, вы — ваенныя людзі. Вы больш чым вайскоўцы. Вы — аблічча нашай краіны».

Кіраўнік дзяржавы згадаў вострыя пытанні ратацыі супрацоўнікаў МЗС. «Быў цэлы пул «вопытных» дыпламатаў, яны ездзілі выключна па маршруце: любілі ездзіць прынамсі ў Нью-Ёрк, Лондан, Жэневу, затое ў Нігерыю пасла знайсці не можам, — канкрэтызаваў Аляксандр Лукашэнка. — Мяркую, у цэлым вы разабраліся з гэтым пытаннем. Хоць то тут, то там працягвае выкрывацца такое, што за галаву хапаешся. Паслухайце, у нас ёсць без дыпламатаў добрыя людзі, гаспадарнікі, як мы іх называем. Ну, будзе яшчэ адзін перакладчык там, талковы, які, акрамя перакладу, будзе яшчэ чымсьці займацца. Трэба знайсці талковага туды кіраўніка».

Прэзідэнт яшчэ раз скіраваў увагу на адказнасць за карупцыю: «Не апускайцеся да крыміналу, прашу вас. Спакус усюды шмат. Усё гэта ўсплывае і б'е потым так, што цяжка будзе падняцца. А вы ў асноўным маладыя людзі. Вам да пенсіі яшчэ працаваць і працаваць і сям'ю забяспечваць».

Аляксандр Лукашэнка канстатаваў, што за год з невялікім корпус паслоў і генконсулаў абнавіўся больш як на 40 %. «Рэалізоўваецца ўстаноўка аб умацаванні міністэрства вопытнымі спецыялістамі з іншых галін, тымі, хто рукамі памацаў вузлы і агрэгаты машын і механізмаў, якія выпрацоўваюцца ў Беларусі, — удакладніў ён. — Гэта ўжо цяпер вашы кадры, Максім Уладзіміравіч (Рыжанкоў, міністр замежных спраў. — «Зв».). І не забывайцеся пра меры бяспекі ў пасольствах. Час няпросты. Саветнікі па бяспецы павінны працаваць на поўную катушку, як у часы СССР. Павінна быць забяспечана наяўнасць шыфравальнага абсталявання для хуткага і абароненага інфармавання». МЗС разам з КДБ пастаўлена задача давесці гэту тэму да розуму.

## «БЕЗ ГАТОЎНАСЦІ АДСТОЙВАЦЬ НАЦЫЯНАЛЬНЫЯ ІНТАРЭСЫ БЕЛАРУСІ НІЧОГА НЕ БУДЗЕ!»

Закрануў кіраўнік дзяржавы і тэму ўступной кампаніі. «На верхніх радках у абітурыентаў — спецыяльнасці «Сусветная эканоміка», «Міжнароднае права», — праінфармаваў ён. — Сёлета на іх у БДУ залімітавы прахадны бал на бюджэт — 400. Усе жадаюць быць міжнароднікамі. Побач «Міжнародная канфлікталогія», «Міжнародная лагістыка» — усё тое, што нам патрэбна, тое, што тут абмяркоўваем».

Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка заўважыў: у МЗС Беларусі ў большасці размяркоўваюцца выпускнікі расійскага Маскоўскага дзяржаўнага інстытута міжнародных адносін, а не БДУ. Кіраўнік дзяржавы паставіў задачу знешнепалітычнаму ведамству разам з Міністэрствам адукацыі прааналізаваць гэту сітуацыю. «Нельга, каб самая таленавітая беларуская моладзь ішла ў нашу флагманскую ВНУ, дзе пасля 2020 года навялі парадак, а потым апынулася перад зачыненымі дзвярыма профільнага міністэрства, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Няўжо мы не можам на годным узроўні «абкатаць» у іншых міністэрствах або ў выканкамах, дапусцім, гэтых людзей? А потым Максім Уладзіміравіч іх забярэ. Гэта наш будучы «залаты фонд» і рэзерв. Што там казаць, гэта самыя таленавітыя хлопцы і дзяўчаты. Гэта цвет нацыі сядзіць, калі мазгі, вядома, нармальныя».

Засяродзіў увагу кіраўнік дзяржавы і на сямейным пытанні. «Мы патрабуем ад дыпламатаў быць узорам і ў працы, і ў побыце, — канстатаваў ён. — Стараемся накіроўваць за мяжу толькі сямейных людзей, але пры гэтым «выдзіраем» з эканомікі жонак і мужоў, якім у выніку і кар'еру не пабудаваць, і на нармальную пенсію зарабіць цяжка. А сярод іх большасць з вышэйшай адукацыяй і пэўным жыццёвым досведам».

Прэзідэнт пацікавіўся, што трэба зрабіць, каб яны як мага хутчэй вярталіся да працы ў Беларусі, прыносілі карысць эканоміцы. «У нас не тая сітуацыя, каб выштурхоўваць кваліфікаваных людзей у хатнія гаспадыні», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. У гэтай сувязі Мінпрацы і сацабароны пастаўлена задача ўважліва паглядзець на гэтае пытанне і, дзе трэба, унесці прапановы па карэкціроўцы працоўнага заканадаўства.

*(Заканчэнне на 6–7-й стар.)*

# «ГЭТА НЕ ПРА ПАЛІТЫКУ. ПЕРШ ЗА ЎСЁ І НОВЫЯ

*(Заканчэнне. Пачатак на 2–й стар.)*

Рэзюмуючы, кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што поспех у дасягненні нашых мэт напрамую залежыць ад дакладнага выканання пастаўленых задач і бездакорнай дысцыпліны. «Вы — больш чым вайскоўцы, — яшчэ раз паўтарыў ён. — Памятайце: без гатоўнасці адстойваць нацыянальныя інтарэсы Беларусі нічога не будзе! Ці будзе, але ўжо без вас, чаго не хацелася б. Мне вельмі не хацелася б. Я часта кажу: вы мае дзеці. 2020 год у сістэме МЗС мы больш не паўторым. Таму галавой адказваеце кожны за свой рэгіён і краіны акрэдытацыі. Вам пра гэта гаварылася на прызначэнні, і кожнаму дадзены канкрэтныя даручэнні».

Пры гэтым беларускі лідар звярнуў увагу на тое, што пры агульным прыярытэце эканомікі задачы паслам ставяцца персанальныя. «У сувязі з гэтым і да ацэнкі эфектыўнасці іх вырашэння таксама варта падыходзіць строга індывідуальна», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

## МЫ ПАВІННЫ ВЫРАБЛЯЦЬ КАНКУРЭНТНЫЯ ПА ЦАНЕ ТАВАРЫ, АДАПТАВАНЫЯ ПАД ПАТРЭБЫ КАНКРЭТНЫХ РЫНКАЎ

Міністр замежных спраў Максім Рыжанкоў далажыў, што ўсе даручэнні, дадзеныя Прэзідэнтам на нарадзе ў 2021 годзе, выкананы: забяспечаны рост знешняга гандлю таварамі і паслугамі, прыцягнуты замежныя інвестыцыі ў зададзеных параметрах, актывізаваны перагаворы аб заключэнні пагадненняў аб свабодным гандлі ЕАЭС з трэцімі краінамі. Распрацаваны і зацверджаны комплексныя стратэгіі падтрымкі экспарту, усебаковага супрацоўніцтва з краінамі далёкай дугі, дырэктывы аб развіцці двухбаковых адносін з Кітаем да 2025 года. Прыняты меры ў адказ да краін і кампаній, якія праводзяць санкцыйную палітыку, меры па зніжэнні гандлёвых бар'ераў і абмежаванняў, абароне ўнутранага рынку і інтарэсаў суб'ектаў гаспадарання, удасканаленні механізмаў фінансавай і нефінансавай падтрымкі экспарту.

«У рамках рэалізацыі даручэння па пераарыентацыі экспартных патокаў забяспечаны рост экспарту на альтэрнатыўныя рынкі. За чатыры гады забяспечаны прырост экспарту тавараў і паслуг да практычна ўстаноўленага Праграмай сацыяльна-эканамічнага развіцця да 2025 года — 50 мільярдаў долараў», — сказаў Максім Рыжанкоў. Міністр замежных спраў звярнуў увагу, што палепшана структура экспарту. «Доля нафтапрадуктаў і калію ў экспарце паменшана з амаль 20 % да 16 % пры павелічэнні долі высокатэхналагічнай прадукцыі з 3,5 % да 5,5 %, таварная наменклатура пашырана на 216 новых пазіцый. Экспарт паслуг таксама вырас. Нас радуе тое, што камп'ютарныя паслугі вяртаюцца на добрыя пазіцыі ў структуры нашага экспарту. Дадалі за кошт экспарту паслуг па гэтым паўгоддзі 600 мільёнаў долараў, праўда, пры гэтым па паставках тавараў прасяданне. Асноўная прычына — зніжэнне паставак нафтапрадуктаў і прадукцыі машынабудавання. Але калі не лічыць гэтыя катэгорыі, то экспарт па іншых таварах, дзе сапраўды можна прасачыць ролю пасольстваў, вырас амаль на 400 мільёнаў долараў, што вельмі блізка да прагнозу на паўгоддзе», — адзначыў Максім Рыжанкоў.

Асобна міністр спыніўся на сістэмных праблемах і задачах. Адна з іх — нарошчванне фізічнай прысутнасці на знешніх рынках. Прырост экспарту за чатыры гады, што, па словах міністра, не радуе, забяспечаны пераважна за кошт спрыяльнай цэнавай кан'юнктуры. «Цэны выраслі на 30 %, а вось фізічныя аб'ёмы паставак — усяго на 6,2 %, — прывёў лічбы кіраўнік знешнепалітычнага ведамства. — Мы не можам знайсці пакупніка. Дыпламаты па максімуме адпрацоўваюць прапановы, падказваюць галіны, дзе прадукцыя запатрабаваная. Але мы павінны выпрацаваць канкурэнтныя па цане тавары, адаптаваныя пад патрэбы канкрэтных рынкаў, з высокай дабаўленай вартасцю і інавацыйным складнікам. Канкурыраваць становіцца ўсё цяжэй.

Другое пытанне — геаграфічная дыверсіфікацыя экспарту. Міністр адзначыў, што доля Расіі ў экспарце перавышае 65 %. І гэта насцярожвае, бо пачынаецца залежнасць ад кан'юнктуры ў адной краіне. Таму, акцэнтаваў Максім Рыжанкоў, неабходна актыўна дыверсіфікаваць геаграфію беларускіх паставак, у тым ліку датычна краін далёкай дугі. Але ў гэтым кірунку існуе канкурэнцыя з боку іншых краін, у прыватнасці Кітая і Турцыі. На што Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што гэта ёсць, але гэта не крытычна. «Нам жа не трэба столькі, як Кітаю. Нам трэба зусім няшмат у кожнай краіне», — адзначыў ён. Па словах Прэзідэнта, калі раскласці на дэталі, то працаваць можна ў кожнай асобнай краіне. Галоўнае — актывізавацца.



Максім Рыжанкоў адзначыў, што дыпламаты робяць немала намаганняў для прасоўвання беларускіх тавараў на далёкія рынкі. Але здараецца, што працэсы тармозіць інертнасць саміх прадпрыемстваў, якім прасцей працаваць з расійскімі партнёрамі і краінамі СНД.

Па яго словах, кардынальна зменены падыходы да планавання экспартнай дзейнасці. Распрацавана праграма дзейнасці ўрада на 2025—2029 гады. «У адпаведнасці з ёй мы распрацоўваем на найбліжэйшую перспектыву — двухгадовыя краінавыя і на рэгіёны Расіі — дарожныя карты па нарошчванні і дыверсіфікацыі экспарту, на сярэднетэрміновую перспектыву — галіновыя экспартныя стратэгіі на 2026—2029 гады», — далажыў Максім Рыжанкоў. На сёння зацверджана 17 краінавых дарожных карт на 2026—2027 гады.

Гаворачы аб такім пытанні, як удасканаленне сістэмы продажаў, міністр звярнуў увагу, што, нягледзячы на даручэнне Прэзідэнта аб рэалізацыі прадукцыі на больш далёкіх базісных умовах, усё яшчэ вялікая доля гандлю «ад варот». Паводле яго слоў, варта прадоўжыць адпрацоўку комплексных рашэнняў па пашырэнні геаграфіі лагістыкі, зніжэнні выдаткаў, максімальным уцягванні беларускіх экспарцёраў і перавозчыкаў.

Гаворачы аб эфектыўнасці падтрымкі экспарту, Максім Рыжанкоў заўважыў, што галіны, бізнес-структуры, экспарцёры нястомна патрабуюць ад урада і МЗС укараніць новыя механізмы фінансавання экспарту. У той жа час практычна не выкарыстоўваюць для прасоўвання экспарту на далёкую дугу нават тыя інструменты, якія ёсць.

«Урадам вызначаны новыя падыходы да ўдасканалення механізмаў крэдытавання экспарту. Плануецца ўвядзенне дыферэнцыраванага падыходу да памераў дзяржпадтрымкі: чым больш складаны тавар і аддалены рынак збыту, тым большы аб'ём субсідзіравання з бюджэту працэнтнай стаўкі па экспартным крэдыце. Міністэрствам замежных спраў распрацоўваюцца прапановы ў дзеючы Указ «Аб падтрымцы экспарту», які прадугледжвае павелічэнне кратнасці часткова пакрыцця выдаткаў пры ўмове ўдзелу ў міжнародных спецыялізаваных выставах у розных краінах», — далажыў Максім Рыжанкоў.

Гэтак жа, па словах міністра, не менш важныя, чым экспарт, замежныя інвестыцыі ў нашу краіну. Ён адзначыў: штогадовы аб'ём прамых замежных інвестыцый у нашу эканоміку павінен складаць не менш за 4-5 мільярдаў долараў у год. Але на справе прыцягваюць у тры разы менш. Максім Рыжанкоў адзначыў, што такія краіны, як ААЭ, Катар, Аман гатовыя ўкладваць сродкі ў Беларусь. Але патрэбны прапановы, якія змогуць «зачапіць» патэнцыяльных інвестараў.

## ПАШЫРЭННЕ ЭКСПАРТНЫХ МАГЧЫМАСЦЯЎ. СПЫТАЮЦЬ НАЙЖОРСТКА

Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Казахстан Аляксей Багданаў праінфармаваў аб перспектывах пашырэння экспартных паставак на казахстанскі рынак.

Пасол агучыў найбольш перспектыўныя кірункі, якія дазволяць забяспечыць стабільную і сістэмную работу на казахстанскім рынку. Стаўку, па яго словах, варта рабіць на больш шырокае прасоўванне машынабудаўнічай тэхнікі і стварэнне сумесных зборачных вытворчасцяў, абмен напрацоўкамі і кампетэнцыямі ў аграрнай сферы. Асобным кірункам работы, па меркаванні дыпламата, можа стаць пастаўка на спажывецкі рынак Казахстана некаторых беларускіх тавараў, якія карыстаюцца шырокім попытам у жыхароў гэтай краіны.

Стаўку варта рабіць і на рэгіянальнае супрацоўніцтва. «Як паказвае станоўчы вопыт з Расійскай Федэрацыяй, прамое і жывое ўзаемадзеянне рэгіёнаў дазваляе актывізаваць усе магчымыя бізнес-працэсы і максімальна збліжаць суб'екты гаспадарання», — заўважыў Аляксей Багданаў.

Міністр прамысловасці Андрэй Кузняцоў пагадзіўся з заўвагамі пасла Беларусі ў Казахстане, якія, па яго словах, будуць улічаны. Інфармуючы аб рабоце сістэмы Міністэрства прамысловасці па нарошчванні экспарту на замежныя рынкі, кіраўнік ведамства далажыў, што ў бягучай пяцігодцы сістэма Мінпрама паказала гатоўнасць да рэагавання на сучасныя выклікі і аператыўную рэалізацыю пытанняў у складаных умовах.

«У 2024 годзе дасягнулі аб'ём экспарту ў 6,5 мільярда долараў — гэта максімальнае значэнне за апошнія 10 гадоў, — сказаў міністр прамысловасці. — У цэлым у бягучай пяцігодцы (з 2020 года да бягучага перыяду 2025-га) тэмп росту прамысловага экспарту, у тым ліку дзякуючы рабоце на перспектыўных рынках Азіі, Афрыкі, Блізкага Усходу і Паўднёвай Амерыкі, у гэтых рэгіёнах склаў 143 % росту».

Андрэй Кузняцоў звярнуў увагу на недастатковыя намаганні па дыверсіфікацыі паставак і залежнасць ад аднаго рынку. «Але работу мы вядзём, практычна з усімі пасламі асабіста правёў сустрэчы, — удакладніў ён. — Ёсць разуменне, куды нам ісці. Для паглыблення дыверсіфікацыі экспарту ў 2025—2026 гадах упор зроблены на краінах далёкай дугі. Ключавым кірункам работы ў бягучым годзе з'яўляецца комплексная механізацыя сельскай гаспадаркі Нігерыі, Зімбабвэ. Усюды, дзе прысутнічае тэхніка Мінпрама, забяспечаны сэрвіс і запасныя часткі. Гэта наша асноўнае патрабаванне. Цяпер праводзім рэвізію, калі дзесьці будзе недастаткова, мы ўсё выправім».

На Блізкім Усходзе ключавы партнёр Беларусі па пастаўцы тэхнікі — Пакістан. Актыўна айчынныя машыны паступаюць на рынкі Сірыі і Лівана. Буйны кантракт па пастаўках камунальнай і дарожна-будаўнічай тэхнікі рэалізоўваецца з Нікарагуа. І гэта далёка не ўся геаграфія экспарту тэхнікі Мінпрама. Але, па словах міністра, ёсць і рынкі, якія ў поўным аб'ёме не выкарыстоўваюцца.

«З улікам умоў на замежных рынках і накіраванасці на лакалізацыю вытворчасцяў дадатковая апора далейшага росту экспарту прамысловай прадукцыі — стварэнне сумесных зборачных прадпрыемстваў на тэрыторыі замежных краін, — адзначыў Андрэй Кузняцоў. — У першую чаргу будзем арганізоўваць сумесныя прадпрыемствы ў тых краінах, дзе мы прадаём тэхніку і дзе яна запатрабавана, з магчымасцю яе рэалізацыі ў трэція краіны. Лічым зборку тэхнікі з замежнымі партнёрамі адным са стратэгічных кірункаў работы».

«Вы па экспарце, я так разумею, да 100 % не дацягваеце», — удакладніў Прэзідэнт.

«Сёння бачым у раёне 92-93 % па выніках года, работу цяпер вядзём», — сказаў міністр прамысловасці.

«Я папярэджваў цяперашняга Прэм'ер-міністра і вас папярэджваю: спытаем надзвычай жорстка, па экспарце перш за ўсё, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — А не дай бог, вы створыце праблему на прадпрыемствах (а гэта ж гігантскія прадпрыемствы, кампаніі: «Гомсельмаш», МТЗ і гэтак далей), крыўдуйце самі на сябе. Таму

# ГЭТА ЭКСПАРТ ІНВЕСТПРАЕКТЫ»

з Прэм'ер-міністрам вы адказваеце сёння за прарыў на гэтым фронце».

Міністр эканомікі Юрый Чабатар праінфармаваў аб рабоце па прыцягненні прамых замежных інвестыцый у эканоміку Беларусі. У бягучых умовах, па яго словах, стаўка робіцца на айчыннага інвестара. У апошнія гады гэта задача, як ён праінфармаваў, паступова вырашаецца.

«Летась прыраслі на 8 % па інвестыцыях у асноўны капітал, — канкрэтызаваў міністр эканомікі. — У бягучым годзе дабавілі яшчэ плюс 14 %, доля ВУП — ужо больш як 18 %. Рэалізавалі за пяцігодку каля 650 інвестпраектаў. Такім чынам, краіна можа ўласнымі сіламі развіваць інвестыцыйны патэнцыял.

Юрый Чабатар паведаміў, што ў краіне больш як 5 тысяч кампаній з замежным капіталам, што складае 3,4 % ад агульнай колькасці. Ён звярнуў увагу на эфектыўнасць канцэнтрацыі прытоку інвестыцый з некалькіх краін. «У сувязі з гэтым паслам пастаўлена задача прыцягваць у Беларусь замежных інвестараў, — праінфармаваў міністр эканомікі. — Ключавыя сферы інвесціравання — апрацоўчая прамысловасць, сельская гаспадарка, энергетыка. Ужо рэалізаваны значныя праекты з прыцягненнем замежных інвестараў у нашу краіну. Таму кропкавая работа з тымі інвестарамі, у якіх ёсць праекты, — найважнейшая задача для паслоў».

На будучую пяцігодку ставіцца задача забяспечыць рост інвестыцый на 17 %.

Старшыня Праўлення Нацыянальнага банка Раман Галоўчанка агучыў шэраг праблем беларускага экспарту. «Нам не хапае капіталу, — канкрэтызаваў ён. — Таму трэба прыцягваць партфельных інвестараў і запускаць іх у асноўны капітал гэтых праектаў. Па-першае, гэта дасць нам магчымасць зэканоміць на капітале, па-другое, мы атрымаем партнёра, які будзе зацікаўлены не толькі ў атрыманні прыбытку, а і ў прасоўванні прадукцыі дадзенага прадпрыемства на міжнародны рынак. Менавіта ў такой мадэлі прыцягнення інвестыцый найбольш выгадны шлях нашай эканомікі ў найбліжэйшую пяцігодку».

У сваю чаргу, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што па прыцягненні інвестыцый Беларусь гатова разглядаць любыя інвестыцыйныя праекты і стварыць для гэтага любыя ўмовы. «Не толькі пабудаваць, нешта прадаць, прыцягнуць 15 %, 20 %, 30 %. Любыя!» — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

## «ТРЭБА ВАРУШЫЦЦА — ІНШАГА ШЛЯХУ НЯМА»

Падводзячы вынікі нарады, Аляксандр Лукашэнка выказаў спадзяванне, што гэта размова будзе прадоўжана і ва ўрадзе, і ў міністэрствах, а не проста застанецца парадным мерапрыемствам. Паводле яго, гэтая нарада павінна даць эфект. Не па адзінкавых пытаннях, а па глабальных.

Асобна кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на кропкавыя пытанні, якія абмяркоўваліся на нарадзе. «Нам трэба прапісаць энную колькасць стратэгічных праектаў. Буйных, сярэдніх — няважна. Каб яны былі і мы маглі па свеце хадзіць і прапаноўваць такія праекты. Нефармальна прапісаць. І кроў з носа, трэба дамагацца рэалізацыі гэтых праектаў», — паставіў задачу ён. Прэзідэнт нагадаў, што прапаноў па праектах было нямала, але многія з іх так і не былі рэалізаваны.

Гаворачы аб пастаўках тэхнікі, кіраўнік дзяржавы адзначыў, што, пастаўляючы тэхніку, трэба адразу пастаўляць і камплектуючыя для яе. Гэта важна зрабіць у імя будучыні. Сёння замежным партнёрам важна не толькі купіць нашу тэхніку, але і мець магчымасць яе абслугоўваць. Інакш гэтыя закупкі бессэнсоўныя. «Таму так, павінен быць камплект запчастак і сэрвісныя цэнтры. Мы дамовіліся (асабліва ў нас праблемы ў буйных кампаніях дзяржаўных), давайце адзін магутны сэрвісны цэнтр створым у адным месцы на вобласць або, як вы вырашыце, на краіну. Але каб гэта былі агульныя цэнтры для МАЗ, БелАЗ, МТЗ і да таго падобнае. Можам так зрабіць? Магчыма. Хоць, зноў жа, я не настойваю. Гэта ваша справа. Калі вы лічыце, што лепш і танней кожны паасобку, — рабіце», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Ён звярнуў увагу на тое, што ініцыяваць гэты працэс павінен не пасол, а само прадпрыемства. А задача пасла — рухаць працэс і кантраляваць.

«Мужыкі, як бы ні было складана, трэба варушыцца. Трэба варушыцца — іншага шляху няма, калі мы хочам быць суверэннымі і незалежнымі. А вы ж усе хочаце, у нас МЗС у авангардзе гэтага ідзе — суверэнітэту і незалежнасці, — заявіў беларускі лідар. — Кожны дзень, кожную гадзіну трэба ствараць суверэнітэт і незалежнасць».

Што датычыцца зборачных вытворчасцяў, стварэння сумесных вытворчасцяў і далей лакалізацыі, па словах Прэзідэнта, як бы ні было складана, ад гэтага нікуды не дзецца. «Калі мы хочам працаваць. Ці нам трэба гэтыя вытворчасці закрываць у краіне і развіваць нешта такое, без чаго свет не абыдзецца. Ну слухайце, у нас няма таго, без чаго свет не абыдзецца. Усё, што мы робім, у свеце робяць, і на парадак лепш пакуль», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што сёння няма іншага выйсця, як працаваць, каб не страціць краіну і не загубіць яе. Бо ўсе хочуць жыць у сваёй краіне. «Мы разумеем, што нам усё гэта трэба вытрымаць, што нам трэба жыць у гэтай сістэме, калі хочам быць суверэннымі і незалежнымі. І калі трэба дзесьці плячом прыткнуцца да моцнага суседа, які дапаможа нам забяспечыць бяспеку, — добра. Як толькі з'явілася ядзерная зброя, тон размовы з амерыканцамі і з іншымі зусім іншы. Я кажу: «Мужыкі, вы не думайце, мы не збіраемся нікога бамбіць. Але вы павінны разумець: крок налева — крок направа на тэрыторыю нашай краіны — імгненны адказ будзе», — заявіў Прэзідэнт. — Дык што ў гэтым дрэннага? Якая краіна магла б нам даць такі шчыт? Ніякая, акрамя Расіі. І гэта дарагога варта».

Звяртаючыся да паслоў, беларускі лідар папрасіў аб тым самым, аб чым прасіў іх пры прызначэнні, — выканаць свае абавязкі, забяспечыць экспарт у гэтых цяжкіх умовах.

Асобна кіраўнік дзяржавы звярнуўся да губернатараў, якія таксама прысутнічалі на нарадзе. Для іх цяпер галоўнае пытанне — уборачная кампанія. Яна сёлета праходзіць у вельмі няпростых умовах надвор'я. Паводле слоў Прэзідэнта, у гэтай сітуацыі патрэбны манеўр. Трэба жаць там, дзе ўжо можна жаць. «Манеўраваць трэба кожную гадзіну», — адзначыў ён. Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што падобны год ужо здараўся, і тады прыйшлося прасіць крэдыт у чэхаў для закупкі збожжа. Але тады і камбайны былі — не параўнаць з цяперашнімі. Сёння трэба знайсці добрых механізатараў і ўраджай будзе ўбраны. Таксама, арыентуе Прэзідэнт, неабходна сачыць і за бульбай, рапсам, кукурузай і іншымі культурамі. «Няпросты год, таму трэба, каб усе былі «на варце» і разумна ўбіралі хлеб», — рэзюмаваў ён.

**Валерыя СЦЯЦКО.**
**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота БелТА.**

САЦЫЯЛЬНЫ КЛОПАТ

# СТАМАТАЛОГІЯ, ЭНДАКРЫНАЛОГІЯ, ПЛАСТЫЧНАЯ ХІРУРГІЯ

## У Мінску адкрыўся новы медцэнтр



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

Шматпрофільны медыцынскі цэнтр уключае ў сябе тры асобныя блокі. У першым размешчана 10-я стаматалагічная паліклініка з прапускной здольнасцю 330 наведванняў за змену. У другім — Мінскі гарадскі клінічны эндакрыналагічны цэнтр, разлічаны на 364 наведванні. Трэці блок займае клінічны цэнтр пластычнай хірургіі і медыцынскай касметалогіі, здольны прымаць да 300 пацыентаў за змену.

Так, 10-я стаматалагічная паліклініка, якая функцыянуе з 1982 года, атрымала новы будынак, абсталяваны сучасным высокатэхналагічным абсталяваннем. У структуры паліклінікі арганізаваны артапедычнае і артадантычнае аддзяленні, зубатэхнічная лабараторыя, гарадскі кабінет ранняй дыягностыкі анкалагічных захворванняў поласці рота, а таксама інфармацыйна-метадычны цэнтр па стаматалогіі. На базе ўстановы плануюць размясціць кафедры БДМУ. Паліклініка забяспечана сучасным высокатэхналагічным абсталяваннем: стаматалагічныя комплексы і ўльтрагукавыя апараты розных функцый, панарамная дэнтальная рэнтгенаўская ўстаноўка, дыятэрмакаагулятар стаматалагічны, прылады для зубатэхнічнай лабараторыі (лабараторны 3D-сканер, 3D-прынтар, зубатэхнічная вакуумная печ).

Як адзначыла **галоўны ўрач паліклінікі Алена ЗАЛАТУХІНА**, пераезд у новы будынак адкрыў перад калектывам прынцыпова новыя магчымасці.

— Сёння ў нас з'явіўся паўнавартасны артапедычны блок з сучаснай зубатэхнічнай лабараторыяй, абсталяванай па апошнім слове тэхнікі. У складзе ўстановы будзе працаваць і артадантычнае аддзяленне. Гэта дазволіць аказваць комплексную стаматалагічную дапамогу, якая ўключае тэрапеўтычнае, хірургічнае і артапедычнае лячэнне, — расказала яна.

Мінскі гарадскі эндакрыналагічны цэнтр аказвае спецыялізаваную дапамогу насельніцтву сталіцы. У ім функцыянуюць эндакрыналагічныя аддзяленні, кабінеты УГД, функцыянальнай і лабараторнай дыягностыкі, а таксама праводзіцца работа школ цукровага дыябету для пацыентаў з I і II тыпам захворвання.

Тут плануецца арганізацыя аддзялення функцыянальнай дыягностыкі з магчымасцю правядзення электранейраміяграфіі ніжніх канечнасцяў, а таксама сутачнага манітарыравання артэрыяльнага ціску і ЭКГ па Холтэру. Гэта дазволіць выяўляць ускладненні цукровага дыябету і іншых эндакрынных захворванняў на ранніх стадыях.

Асаблівая ўвага ў цэнтры аддадзена аддзяленню «Дыябетычная ступня». У яго структуры абсталявана амбулаторная аперацыйная, што з'яўляецца ўнікальнай практыкай не толькі для Беларусі, але і ўсёй постсавецкай прасторы. Цэнтр першым у краіне ўкараняе інавацыйны метад лячэння хранічных язваў пры сіндроме дыябетычнай ступні ў амбулаторных умовах, што накіравана на паляпшэнне якасці жыцця пацыентаў і прадухіленне цяжкіх ускладненняў.

Клінічны цэнтр пластычнай хірургіі і медыцынскай касметалогіі — адзіная ў краіне дзяржаўная арганізацыя, якая аказвае поўны спектр паслуг у галіне пластычнай і эстэтычнай хірургіі. У новым будынку размешчаны аддзяленні пластычнай эстэтычнай хірургіі, амбулаторнай хірургіі і касметалогіі. Гэта дазволіць пашырыць пералік медыцынскіх паслуг, якія аказваюцца, павялічыць колькасць аператыўных умяшанняў і стварыць новыя кірункі, у ліку якіх — оталарынгалогія, акушэрства і гінекалогія.

— Сёння мы атрымалі новы будынак плошчай больш за 5 тысяч квадратных метраў, у якіх створаны камфортныя ўмовы як для пацыентаў, так і супрацоўнікаў. Штогод клінічны цэнтр наведваюць каля 90 тысяч пацыентаў, у сярэднім праводзіцца 2,5 тысячы аперацый па кірунках пластычнай хірургіі і медыцынскай касметалогіі, — адзначыла **галоўны ўрач клінічнага цэнтра пластычнай хірургіі і медыцынскай касметалогіі Мінска Наталля ПАСТАЯЛКА**. Яна таксама дадала, што з адкрыццём новага цэнтра пашыраецца пералік паслуг — укараняюцца новыя кірункі, такія як эстэтычная гінекалогія і отарыналарынгалогія. Закуплена сучаснае абсталяванне, у тым ліку ўнікальная сістэма відэадэрматаскапіі для дэрматаанкалогіі, якая дазваляе праводзіць поўнае карціраванне і сканіраванне цела, фіксуючы і аналізуючы дабраякасныя ўтварэнні на скуры.

### Даслоўна

**Старшыня Савета Рэспублікі, упаўнаважаны прадстаўнік кіраўніка дзяржавы ў г. Мінску Наталля КАЧАНАВА** адзначыла:

— Вы ўсе ведаеце, што ахова здароўя ў нашай сацыяльнай палітыцы займае прыярытэтнае месца, таму што здароўе нацыі — вельмі важна. Гэта тое, пра што заўсёды кажа Прэзідэнт нашай краіны. І менавіта па даручэнні кіраўніка дзяржавы гэты будынак, які з'яўляўся доўгія гады недабудаваным, быў перададзены Мінску для таго, каб тут адкрыць такі выдатны, цудоўны клінічны цэнтр.

Старшыня Савета Рэспублікі таксама заўважыла, што работа ў сістэме аховы здароўя ў Мінску — гэта тое, чым можна і трэба ганарыцца. Таму што 47 % сацыяльных артыкулаў бюджэту накіраваны на ахову здароўя, і новы медыцынскі цэнтр — не адзіная ўстанова, уведзеная ў эксплуатацыю сёлета.

**Паводле БелТА.**

**ООО «Юридическая компания Аспект»**
**проводит девятые повторные публичные торги в форме открытого аукциона по продаже имущественных прав ликвидируемого юридического лица – иностранного унитарного предприятия «Юколанефть»**

| № п/п | Наименование лота | Начальная цена без НДС, руб. | Шаг торгов (5 %), руб. | Задаток для участия в торгах (10 %), руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Дебиторская задолженность, подлежащая взысканию с ООО «АРСнефть» (УНП 291047728) на общую сумму 39 876,99 бел. руб. | 9 644,84 | 482,24 | 964,48 |
| 2 | Дебиторская задолженность, подлежащая взысканию с ООО «Фолоуми» (УНП 193120458) на общую сумму 2 745,88 бел. руб. | 664,14 | 33,21 | 66,41 |

*Торги назначены на **18.08.2025 г. в 10.30** по адресу: **г. Минск, ул. Тимирязева, д. 65, оф. 401, холл (4-й этаж)**.*
*Срок приема заявок, внесения задатка для участия в торгах – до **15.08.2025 г.** включительно. Заявки принимаются организатором торгов по месту проведения торгов в рабочие дни с 9.00 до 17.30 (по пятницам – до 16.30)*

| | |
|---|---|
| **Продавец** | **Иностранное унитарное предприятие «Юколанефть»** |
| **Организатор торгов** | **ООО «Юридическая компания Аспект»** |
| **Реквизиты для оплаты задатка** | **Иностранное унитарное предприятие «Юколанефть»** р/с BY23TECN30121503000130000000 в ОАО «ТЕХНОБАНК», г. Минск, БИК TECNBY22, УНП 192140296 |

Условия проведения торгов размещены на сайте ООО «Юридическая компания Аспект» – «aspekt-avs.by» в разделе «Актуальные аукционы. Лоты на реализации. Дебиторская задолженность» по ссылке «https://aspekt-avs.by/aykciony_info/»

Объявление о предыдущих торгах опубликовано в газете «Звязда» 27.08.2024 (стр. 6), 22.10.2024 (стр. 14), 13.11.2024 (стр. 12), 22.01.2025 (стр. 14), 08.02.2025 (стр. 12), 05.03.2025 (стр. 8), 12.04.2025 (стр. 4), 10.05.2025 (стр. 11), 20.06.2025 (стр. 7)

Дополнительная информация о порядке проведения торгов по телефону +375 (44) 5986627 в рабочие дни с 9.00 до 17.30 (по пятницам – до 16.30). Ознакомление с документами на лот возможно по месту проведения торгов после предварительного согласования по тел. +375 (44) 5986627

УНП 192140296



ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона/оператор Адрес ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. www.ipmtorgi.by |
| **Продавец** | ООО «Арвит-авто». 220026, г. Минск, пр-т Партизанский, 95В (литер Б4/к), к. 32в |

**Предмет электронных торгов**
**Местонахождение – г. Минск, ул. Лынькова, д. 123**

| № лота | Наименование | Инв. № | Начальная цена (с НДС 20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | Уравнительная платформа, встроенная с поворотной аппарелью 2000х2240, бампер (2 шт.), 2012 г. ввода | 772 | 6 600,00 |
| 2 | | 773 | 6 600,00 |
| 3 | | 774 | 6 600,00 |
| 4 | | 775 | 6 600,00 |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется на счет BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

**Срок подписания договора купли-продажи: 5 (пять) рабочих дней** со дня завершения электронных торгов

**Срок оплаты предмета электронных торгов: 5 (пять) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **8 %** от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 01.09.2025 г. с 11.00 до 13.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок:** заявки на участие в электронных торгах принимаются по **29.08.2025 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 (17) 373 21 33; +375 (44) 704-92-06, E-mail: info@ipmtorgi.by** |



**Плещеницкий сельский исполнительный комитет**
*в рамках работы Указа Президента Республики Беларусь № 116 «Об отчуждении жилых домов в сельской местности и совершенствовании работы с пустующими домами»*

**РАЗЫСКИВАЕТ**
**СОБСТВЕННИКОВ, НАСЛЕДНИКОВ И ЛИЦ, имеющих право пользования жилым домом, расположенным по адресу: д. Лядо, д. 12 Плещеницкого с/с Логойского района Минской области**
(правообладатель – Довгалёнок Мария Ефимовна).
Сельисполком просит граждан, располагающих информацией о собственниках, наследниках и лицах, имеющих право пользования жилым домом, сообщить в Плещеницкий сельисполком по адресу: 223130, Логойский р-н, г. п. Плещеницы, ул. В.И. Ленина, д. 7 либо по телефонам: (801774) 22-3-35; 22-6-35.

УНП 600181684


# У ПОШУКАХ САПРАЎДНАГА

## Любы грыб, які кладзеш у кошык, трэба добра ведаць «у твар»



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

Грыбы — адны з самых загадкавых жывых істот на нашай планеце. Навукоўцы дагэтуль не вызначыліся, да якой навукі іх аднесці — батанікі ці заалогіі. А вось тое, што гэтыя лясныя жыхары забралі не адну тысячу чалавечых жыццяў, — факт дакладны. Мы самі цягнем іх у рот, а пасля ўсё заканчваецца або перасадкай печані, або ўвогуле магілай.

### ЯК АДРОЗНІЦЬ ЯДОМЫ ГРЫБ АД ЯДАВІТАГА «ДВАЙНІКА»



**ШАМПІНЬЁН**
Тоўстая і шчыльная ножка
Ружовыя пласцінкі пад шапачкай
Характэрны грыбны водар

**БЛЕДНАЯ ПАГАНКА**
Тонкі ствол
Белыя пласцінкі пад шапачкай
Звычайна ніяк не пахне

**САПРАЎДНЫЯ АПЕНЬКІ**
Белыя пласцінкі пад шапачкай, якія не цямнеюць
Шчыльнае колца з плёнкі на ножцы

**НЕСАПРАЎДНЫЯ АПЕНЬКІ**
Пласцінкі шэра-жоўтыя або крэмавыя, якія хутка цямнеюць пры пашкоджанні



**БЕЛЫ ГРЫБ**
Заўсёды белая мякаць, не цямнее пры зрэзе

**ЖОЎЦЕВЫ ГРЫБ**
На месцы зрэзу мякаць адразу цямнее
Горкі смак
Буры ўзор у выглядзе сеткі на ножцы

**МАСЛЯК**
Слізкая ліпкая шапачка
Слізістая плёнка на шапачцы цягнецца пры здыманні

**ПЕРЦАВЫ ГРЫБ**
Сухая шапачка
Скурка шапачкі не цягнецца пры здыманні
Перцава-пякучы смак

Размова тут, канешне, пра грыбы ядавітыя. Ядомыя грыбы — гэта хоць і не вельмі карысная, але бяспечная смаката. Уся праблема ў тым, што людзі, здараецца, не адрозніваюць адны ад другіх. А самае надзейнае правіла: не ведаеш, што за грыб, — не бяры — выконваюць, на жаль, далёка не ўсе.

Мы сабралі парады дасведчаных грыбнікоў наконт таго, як адрозніць ядомы грыб ад небяспечна-атрутнага. Камусьці, магчыма, яны пададуцца элементарнымі. Але лепш лішні раз паўтарыць пройдзенае, чым пасля шкадаваць.

### ЯК АДРОЗНІЦЬ ЯДАВІТЫ ГРЫБ?

Хтосьці скажа: пакаштаваць. Калі смак горкі ці пякучы — выкідвай. Гэтага рабіць не варта. Тая ж бледная паганка вельмі ядавітая, і нават дробненькая яе частка можа выклікаць сур'ёзную інтаксікацыю арганізма. Так што лепш даверыцца не смаку, а іншаму асноўнаму пачуццю — зроку.

❶ Паглядзіце на ўнутраны бок грыбной шапачкі. З асцярогай пастаўцеся да «незнаёмца», у якога яна пласцiністая, — такія часцей сустракаюцца ў ядавітых. У ядомых жа часцей шапачка трубчастая.

❷ Ножка, асабліва яе ніжняя частка, таксама можа шмат сказаць: у тых жа паганак усіх відаў там ёсць невялікае патаўшчэнне.

❸ Калі на ножцы ёсць «спаднічка», размешчаная бліжэй да шапачкі, гэты грыб таксама трэба ставіць пад вялікае сумненне.

### НЕЯДОМЫЯ «ДВАЙНІКІ»

У многіх любімых праверaных грыбоў ёсць «браты», вельмі на іх падобныя знешне, але ні ў якім разе не па прыдатнасці ў ежу. Ужыванне такіх двайнікоў можа скончыцца вельмі дрэнна. Нагадаем, чым яны адрозніваюцца ад арыгіналаў.

❍ **Баравік / жоўцевы і сатанінскі грыбы**

Знешне яны падобныя да ядомага баравіка. Але пры пільным аглядзе можна заўважыць адметныя асаблівасці. У жоўцевага грыба на ножцы вы ўбачыце цёмную сетку, а ў сатанінскага — чырвоную. Паназірайце, ці мяняе колер зрэз грыбной ножкі. Калі ён мае ружовае адценне, то гэты грыб з'яўляецца неядомым. Сапраўдны баравік пры разразанні ножкі колер не мяняе.

❍ **Падасінавік / несапраўдны падасінавік**

Колер шапачкі ў двайніка больш цёмны, чым у сапраўднага чырвонагаловіка. Таксама можна зрабіць на ножцы надрэз і паглядзець на колер. У грыба, які без боязі можна класці ў кошык, ножка пацямнее (пасінее). А ў несапраўднага падасінавіка — паружавее.

❍ **Падбярозавік / несапраўдны падбярозавік**

У гэтага грыба таксама колер шапачкі цямнейшы, чым у ядомага «брата». Зрэз ножкі будзе мець сіняе адценне ў «падробкі». Яшчэ важная дэталь: несапраўдны падбярозавік не расце пад бярозамі.




❍ **Лісічкі / несапраўдныя лісічкі**

«Двайнікі» больш яркія па афарбоўцы — яны ярка-аранжавыя. Яшчэ адна вызначальная прыкмета: калі такі грыб надламаць, з яго будзе выдзяляцца вадкасць, падобная на малако. У сапраўдных грыбоў мякаць шчыльная і сухая.

### МІФЫ АБ ЯДОМЫХ І ЯДАВІТЫХ ГРЫБАХ

❶ Ёсць меркаванне, што толькі ядомыя віды грыбоў прыемныя на смак. Насамрэч і неядомыя прадстаўнікі могуць мець падобныя якасці. Вызначаць грыбы, прыдатныя для прыгатавання, неабходна толькі па знешніх прыкметах. Каштаваць іх нельга: падобныя эксперыменты могуць прывесці да негатыўных наступстваў.

❷ Некаторыя думаюць, што маладыя грыбы бяспечныя, нават калі яны ядавітыя, бо толькі па меры росту грыба ў ім назапашваюцца небяспечныя для жыцця чалавека рэчывы. Насамрэч у ежу смяротна небяспечна ўжываць любыя грыбы, якія адносяцца да ядавітых і неядомых, незалежна ад этапаў іх росту.

❸ Памылковай з'яўляецца версія, што абсалютна ўсе ядавітыя грыбы маюць непрыемны пах. Насамрэч гэта не так. Справа ў тым, што некаторыя грыбы не маюць паху ўвогуле. Іншыя ж прадстаўнікі неядомых грыбоў могуць мець, наадварот, прыемны водар.

❹ Нават грыбы, на якіх ёсць насякомыя або сляды зубоў жывёл, могуць аказацца неядомымі для чалавека. Калі вы заўважылі на шапачцы чарвякоў, смаўжоў, не варта быць упэўненым, што гэтыя грыбы можна ўжываць у ежу.

❺ Адной з самых небяспечных памылак з'яўляецца міф аб тым, што алкаголь здольны нейтралізаваць атрутныя рэчывы. Наадварот, алкаголь дзейнічае падобна каталізатару. Ужыванне падобных напояў спрыяе інтаксікацыі арганізма.

❻ Не варта спадзявацца на тое, што тэрмічная апрацоўка здольная пазбавіць грыбы ад таксінаў. Колькі паганку ні вары, яна паганкай і застанецца, у тым ліку і па атрутных якасцях.

Дарэчы, атруціцца можна і баравіком. Калі ён стары, чарвівы або вы зрэзалі яго каля ажыўленай аўтамабільнай дарогі.

***Цяпер, калі мы нагадалі вам асноўную важную інфармацыю, можаце смела ісці ў лес. А не, забыліся яшчэ раз сказаць самае галоўнае правіла дасведчанага грыбніка: калі грыб выклікае ў вас хаця б тысячную долю сумнення — пакіньце яго там, дзе ён расце!***

***І ўдалага вам «ціхага палявання»!***

ЖЫВІЦЕ Ў БЯСПЕЦЫ

# ПАЙСЦІ І ВЯРНУЦЦА

## Да паходу ў лес варта падрыхтавацца



Нават самыя заўзятыя грыбнікі і ягаднікі кажуць, што наваколле ўвесь час змяняецца, таму заблукаць на раней знаёмых сцежках і палянках не складана. Тым больш рызыкоўна, калі маршрут аматараў збору лясных дароў пралягае не праз «свой» лес. Нярэдка грыбнікі перааацэньваюць свае сілы ў пошуках лісічак ды баравікоў, калі пераадольваюць вялікія адлегласці. Вярнуцца назад ім не дазваляе здароўе. Іншыя, упэўненыя ў сваіх сілах, будучы ў лесе, не звяртаюць увагі на арыенціры — у выніку забрыдаюць у незнаёмыя месцы.

Ідучы ў лес, людзі настолькі перасталі клапаціцца аб уласнай бяспецы, што не задумваюцца аб належнай падрыхтоўцы да «ціхага палявання», спадзяваючыся на ратавальнікаў у выпадку надзвычайнай сітуацыі, забываюць узяць з сабой нават тэлефон або папярэдзіць родных аб сваіх планах. Безумоўна, супрацоўнікі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, калі да іх паступіць адпаведны сігнал, неадкладна выедуць на пошукі, але колькі на гэта спатрэбіцца часу — ужо іншае пытанне. У такім выпадку варта задумацца вось пра што: у той час, як ратавальнікі шукаюць вас у лесе, дзесьці, магчыма, у больш крытычнай сітуацыі, патрэбна іх дапамога.

### У КІШЭНІ — ЗАРАДЖАНЫ ТЭЛЕФОН

Мабільны тэлефон (абавязкова падзараджаны!) — гэта галоўнае, што трэба ўзяць з сабой у лес. Па-першае, вы самі зможаце паведаміць ратавальнікам, што заблукалі, патлумачыць, у якім месцы ўваходзілі ў лес. Па-другое, дзякуючы геалакацыі тэлефона з дакладнасцю будзе ўстаноўлена ваша месцазнаходжанне.

Хто ведае, колькі б часу спатрэбілася на пошукі грыбніка ў Пухавіцкім раёне, калі б ён не ўзяў з сабой у лес мабільнік. Высветлілася, што ў грыбы мужчына накіраваўся ў шэсць гадзін вечара. У дзесяць ён патэлефанаваў у МНС і сказаў, што не можа самастойна знайсці дарогу дадому. На працягу гадзіны ратавальнікі выявілі згубленага ў лесе. Увесь гэты час яны размаўлялі з ім па тэлефоне, што дазволіла не толькі больш эфектыўна правесці пошукавую аперацыю, а і падтрымліваць мужчыну ў стабільным маральным стане.

14 чалавек (ратавальнікам дапамагалі супрацоўнікі міліцыі) і чатыры адзінкі тэхнікі былі задзейнічаны ў пошуку 84-гадовай жанчыны на Гродзеншчыне. У МНС патэлефанаваў яе муж і папрасіў дапамогі. Як высветлілася, раніцай суджэнцы пайшлі ў грыбы. Пасля некалькіх гадзін збору жанчына стамілася і засталася на паляне, пакуль яе муж пайшоў па машыну. Вярнуўшыся, мужчына не застаў жонку на месцы, на яго голас яна не адгукалася. Пры абследаванні лясного масіву ратавальнікі і міліцыянеры знайшлі пенсіянерку, даставілі яе да машыны хуткай дапамогі. На шчасце, шпіталізацыя выратаванай не спатрэбілася.

І такіх прыкладаў у ратавальнікаў — кожны дзень па некалькі.

### ПАПЯРЭДЗЬЦЕ РОДНЫХ

Як звяртае ўвагу **афіцыйны прадстаўнік Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Яўген БАРАНОЎСКІ,** самая галоўная рэкамендацыя для тых, хто збіраецца ў лес, — праінфармуйце аб сваіх планах родных, блізкіх або суседзяў. «Важна ўлічваць умовы надвор'я, якое апошнім часам непрадказальнае, — удакладняе ён. — Калі вы бачыце папярэджанне МНС аб небяспечных метэаралагічных з'явах, то, калі ласка, устрымайцеся ад паходу ў лес. Акрамя таго, што можна згубіцца, павышаюцца шанцы трапіць у стыхію, што можа прывесці да пэўных наступстваў».

Збіраючыся ў лес, варта сур'ёзна падысці да выбару адзення. Апранацца пажадана ярка: у выпадку, калі вы збіліся з маршруту, чырвоная куртка або аранжавая хустка, кепка дапамогуць хутчэй вас заўважыць. Вельмі важна, каб адзенне і абутак не прамакалі.

Ідучы ў грыбы або ягады нават на непрацяглы час, варта ўзяць з сабой невялікі запас ежы, ваду, нож і запалкі. Калі заблукаеце, гэты просты набор дазволіць пратрымацца пэўны час. Тым, хто рэгулярна прымае лекі, ратавальнікі рэкамендуюць узяць іх з сабой. Калі самаадчуванне не вельмі, то «ціхае паляванне» або збор ягад варта ўвогуле адкласці на потым. Не лішнім будзе «ўзброіцца» компасам і картай. Калі вы дрэнна арыентуецеся на мясцовасці, то ратавальнікі ўвогуле рэкамендуюць не ісці ў лес.

Яўген Бараноўскі раіць устанавіць у сваім мабільным тэлефоне афлайн-карту, якая дапаможа арыентавацца ў мясцовасці і прасторы. «Калі згубіліся і не можаце самастойна выйсці з лесу або трапілі ў бяду, тэлефануйце ў МНС. Мы абавязкова вам дапаможам», — падкрэслівае афіцыйны прадстаўнік ведамства.

### НЕ ПАНІКАВАЦЬ І ПАДРЫХТАВАЦЦА ДА НАЧЛЕГУ

**Калі вы ўсё ж такі заблукалі, першае, што раяць супрацоўнікі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, — не панікаваць. Пасля варта прыслухацца: гукі нярэдка дапамогуць сарыентавацца. Шум трактара, напрыклад, чуваць за 3-4 кіламетры, брэх сабакі — за 2-3 кіламетры, цягнік — за 10 кіламетраў. Ідзіце на гук і абавязкова выйдзеце да людзей.**

У населены пункт прывядуць і лініі электраперадачы, прасекі, сцяжынкі. Калі на шляху сустрэўся ручай ці рака, ідзіце ўніз па плыні — яны заўсёды прывядуць да людзей.

Самастойна выбрацца з лесу не ўдаецца? Патэлефануйце ў МНС (па нумары 112) і паведаміце, з якога населенага пункта і з якога раёна вы ўвайшлі ў лес, апішыце, што бачыце па баках. Пачынае цямнець — сарыентуйцеся на мясцовасці і падумайце, дзе арганізаваць начлег. Месцам начлегу можа стаць яма ад вывернутага з коранем дрэва. З галінак зрабіце прытулак накшталт будана і подсціл з падручных матэрыялаў. Ліст газеты, запхнуты пад адзенне, зменшыць цеплааддачу ўдвая. Такі ж эфект дае і лістота. Паспрабуйце знайсці ваду. Арганізуючы начлег, паклапаціцеся, каб тыя, хто вас шукае, не прайшлі міма. Напрыклад, павесьце на кусты кепку, насоўку ці ліст паперы, абламіце галінкі, каб прыцягнуць увагу.

Калі вы апынуліся ў лесе без тэлефона і ў вас самастойна не атрымліваецца выйсці да людзей, у любым выпадку супакойцеся і настройцеся на добры зыход. Ніхто ў бядзе вас не пакіне. А каб увогуле не трапіць у такую сітуацыю, збіраючыся на «ціхае паляванне», абавязкова прыслухайцеся да парад ратавальнікаў. Паклапаціўшыся аб уласнай бяспецы загадзя, вы пазбегнеце непрыемнасцяў, а паход у грыбы ці ягады прынясе толькі прыемныя ўражанні.

**Вераніка КАНЮТА.**




ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

***ОАО «Н Холдинг»***
***проводит повторный открытый аукцион по продаже недвижимого имущества, находящегося в собственности***
***ОАО «Минский завод «Термопласт»***

**Аукцион проводится в соответствии с действующим законодательством и Положением ОАО «Н Холдинг» по организации и проведению аукционов по продаже капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей**

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **ЛОТ № 1** | Изолированное помещение с инв. № 500/D-7988205136, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Калиновского, 6/3-2. Площадь: 2921,1 кв. м. Наименование: Производственное помещение. Назначение: Производственное помещение. Обременение: Аренда | | | | |
| **Начальная цена (стоимость) (в т. ч. НДС 20 %), BYN** | **2 273 280,00** | **Задаток, BYN** | **227 328,00** | **Шаг аукциона** | **5 %** |
| **Сведения о продавце, его местонахождение и контактные телефоны** | ОАО «МИНСКИЙ ЗАВОД «ТЕРМОПЛАСТ» Республика Беларусь, 220103, г. Минск, ул. Кнорина, 50. Тел. +375172811340. E-mail: office@oaotermoplast.by | | | | |
| **Сведения об организаторе аукциона** | ОАО «Н Холдинг» 220029, г. Минск, пр-т Машерова, 11, пом. 1. Тел.: 8 029 754 63 46 (Мария) | | | | |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | Договор купли-продажи должен быть заключен в течение **10 (десяти) рабочих дней** со дня утверждения протокола о результатах аукциона | | | | |
| **Возмещение затрат на организацию и проведение аукционов** | Победитель аукциона или единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, в течение 5 (пяти) календарных дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона обязан возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение на основании счета, выставленного организатором аукциона, а также в течение 3 (трех) рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона выплатить вознаграждение организатору аукциона в размере 1 % от цены продажи предмета аукциона на основании счета, выставленного организатором аукциона | | | | |
| **Условия оплаты** | Оплата задатка производится резидентами в белорусских рублях (нерезидентами в белорусских рублях или в долларах США по курсу НБ РБ на дату оплаты) на следующие банковские реквизиты: р/с BY79 AKBB 3012 0000 1634 1000 0000 (BYN) в ОАО «АСБ Беларусбанк», код AKBBBY2X, 220005, г. Минск, пр-т Независимости, д. 56. Получатель – Открытое акционерное общество «Н Холдинг», УНН 101059240, ОКПО 37392696. Если между продавцом и покупателем в течение срока, установленного для заключения договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и порядку оплаты объекта, оплата стоимости имущества должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона | | | | |
| **Место, дата и время приема заявлений на участие в аукционе** | Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются **по 14 августа 2025 года (включительно)** в рабочие дни с 9.00 до 16.55 по адресу: г. Минск, ул. Куйбышева, д. 35-1 | | | | |
| **Место, дата и время проведения аукциона** | Открытый аукцион состоится **15 августа 2025 года** в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Куйбышева, д. 35-1, зал совещаний ОАО «Н Холдинг» | | | | |

Организатор аукциона после опубликования извещения о его проведении вправе в любое время, без объяснения причин, но не позднее чем за 3 календарных дня до даты проведения аукциона, указанной в извещении о проведении аукциона, отказаться от его проведения



**РУП «Торговый дом «Восточный»**
**извещает о снятии с открытого аукциона по продаже недвижимого имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства, назначенного на 02.09.2025, лота № 12 –**
1/2 доли в праве собственности на земельный участок с кадастровым номером 623686605101000501 (назначение – Земельный участок для ведения личного подсобного хозяйства), площадью 0,502 га, расположен по адресу: Минская обл., Минский р-н, Сеницкий с/с, д. Сеница.
**Начальная цена продажи – 126 000,00 бел. руб., задаток – 12 600,00 бел. руб.**
Информация о данном лоте опубликована в газете «Звязда» 15.07.2025 № 133 (30521).
**Контакты организатора аукциона: +375 44 763 62 63; +375 17 275 75 12.**
УНП 101127633



**Главное управление по здравоохранению Брестского облисполкома**
**уведомляет о том, что 28.07.2025 состоялось заседание конкурсной комиссии по выбору исполнителя на выполнение государственного социального заказа, финансируемого путем предоставления субсидий на реализацию проекта в области здравоохранения, направленного на повышение доступности оказания медико-социальной помощи на дому, гражданам с заболеваниями (травмами), приведшими к ограничению способности к самообслуживанию и (или) самостоятельному передвижению и (или) ориентации (ФК 3, ФК 4).**
По результатам конкурса исполнителем признана Брестская областная организация Республиканского общественного объединения «Белорусское Общество Красного Креста».
УНП 291638092

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор аукциона)
извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства.

**Аукцион состоится 27.08.2025 в 10.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.**

**Лот № 1**

Капитальное строение с инв. № 500/С-34648.

Согласно ведомости технических характеристик:
наименование – нет сведений;
назначение – не соответствует фактическому назначению;
площадь – 1819,7 кв. м;
составные части и принадлежности: навес.
Адрес: г. Минск, пр-т Независимости, 58Г.
Обременение:

1. В отношении капитального строения с инв. № 500/С-34648 имеется действующий договор аренды.
2. Арест (постановление следователя от 17.03.2023 № б/н).

Начальная цена – 3 047 868,00 руб.
Задаток – 304 786,80 руб.

Капитальное строение с инв. № 500/С-34648 расположено на земельном участке 500000000008003534 площадью 0,1082 га. Целевое назначение: земельный участок для эксплуатации и обслуживания здания производственного корпуса № 8. Право аренды с 23.02.2011 по 30.11.2049.

Шаг аукциона – 5 %.

1. Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником, и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5 % (далее – Претендент на покупку), – обязан оплатить полную стоимость приобретенного на аукционе Объекта не позднее 20 (двадцати) рабочих дней со дня проведения аукциона. Указанный срок перечисления денежных средств Победителем аукциона (Претендентом на покупку) может быть на основании его письменного ходатайства однократно продлен, но не более чем на 20 рабочих дней.

2. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона.

3. Переход права собственности на приобретенный на аукционе Объект недвижимости осуществляется в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

4. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона.

Организация и проведение аукциона осуществляются в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь и Регламентом о порядке организации и проведения аукционов РУП «Институт недвижимости и оценки» от 29.07.2024.

Порядок проведения аукциона, в том числе об оформлении участия в аукционе содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на электронной торговой площадке «GOSTORG» (gostorg.by).

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7 в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00.

Окончание приема заявлений – **25.08.2025 в 11.00.**

Контактное лицо для осмотра Объекта – Игнатов Иван Владимирович, +375 (17) 354-53-70, +375 (29) 640-92-76.

**Организатор аукциона:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• gostorg.by • e-mail: torgi@ino.by**

УНП 190055182

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона/ оператор** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. УНП 191224638, www.ipmtorgi.by |
| **Продавец** | ОАО «Гомельский винодельческий завод», 246003, г. Гомель, ул. Рогачевская, 10. УНП 400051877 |
